

ЕЎРАПЕЙСКІ ТЫДЗЕНЬ МАБІЛЬНАСЦІ 4

ПРАДУХІЛЕННЕ ДЭГРАДАЦЫІ ЗЯМЕЛЬ 5



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ВЕРАСНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 179 (29293)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый БАСКАЎ, старшыня Федэрацыі хакея Беларусі:**

*«Федэрацыя хакея Беларусі правяла вялікую работу па заяўцы на правядзенне чэмпіянату свету сумесна з Латвіяй. Пасля таго як мы атрымалі гэта пераважнае права, сталі працаваць у гэтым кірунку разам. Аднак сёння ў Латвіі спрабуюць палітызаваць спорт. Што ж датычыцца спартыўнага складніка, то ў нас добрыя кантакты з Латвійскай федэрацыяй хакея, Міжнароднай федэрацыяй хакея. Няма перадумоў для таго, каб не правесці адзін з найлепшых чэмпіянатаў свету. Сёння не разглядаецца сцэнарый правядзення ЧС-2021 па хакеі самастойна. Але мы правялі выдатны чэмпіянат свету ў 2014 годзе, таму разумеем, што нам хопіць сіл і інфраструктуры, каб зноў правесці чэмпіянат свету асобна».*

# З днём нараджэння, садок!





Фота БелТА.

Новы дзіцячы садок адкрыўся днямі ў мінскім мікраараёне Лошыца-9. Дашкольная ўстанова разлічана на 12 груп поўнага дня (230 месцаў). У ёй прадугледжаны дзіцячыя трэнажоры, басейн, спартыўная і музычная залы, камп'ютарны кабінет, харчблок, укамплектаваны па апошнім слове тэхнікі. Асаблівасць дзіцячага садка ў тым, што дваровыя гульнявыя пляцоўкі маюць гумавае пакрыццё для бяспечнага адпачынку дзяцей.

## КОРАТКА

- **Беларускія дзіцячыя кардыяхірургі правялі ўнікальную аперацыю 930-грамовай малой.**
- «Белавія» прыпыніла рэйсы ў Талін да 30 верасня.
- **Беларускія ваенныя 21—26 верасня возьмуць удзел у стратэгічным камандна-штабным вучэнні «Каўказ-2020», якое пройдзе ў Расіі.**
- Аграрыі Пастаўскага, Верхнядзвінскага і Расонскага раёнаў Віцебскай вобласці завяршылі ўборку збожжавых і зернебабовых.
- **Уздоўж мяжы з ЕС з самалёта будуць раскідваць блістар-прынады з вакцынай для дзікіх жывёл. Браць іх у рукі ці скормліваць хатнім жывёлам забаронена.**

Зваротная сувязь

## ПАРК НЕВЯДОМАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ

**Магіляўчанін змагаецца за навядзенне парадку ў адным з некалі папулярных месцаў адпачынку гараджан. Што перашкаджае?**



**Юрый СЯЗЁМІН ужо не ўпершыню звяртаецца ў газету па дапамогу. Першы раз магіляўчаніна не задавальняў стан двара каля яго дома. Пасля таго як умяшалася газета, парадак там з'явіўся, хоць адна праблема ўсё ж такі засталася — стыхійны выгул сабак. Але Юрый Сямёнавіч разумее, што тут парадак залежыць больш ад саміх уладальнікаў чатырохногіх, чым ад камунальнікаў. Зараз яго больш клапоціць парк адпачынку імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка, які зусім недалёка ад таго месца, дзе ён жыве. І да яго ў Юрыя Сямёнавіча шмат пытанняў. Каб разабрацца ў іх, мы разам прайшліся па самых праблемных месцах парку.** СТАР. 6

Экспертная пляцоўка

## АДНАЎЛЕННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

Беларускія гісторыкі абмеркавалі ўрокі ўз'яднання Заходняй Беларусі і БССР

**Напярэдадні 17 верасня ў сценах рэдакцыі газеты «Звязда» адбылося абмеркаванне падзей восені 1939 года вучонымі Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Дырэктар, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ, загадчык цэнтра новай і навейшай гісторыі Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт Мікалай СМЯХОВІЧ і загадчык аддзела навейшай гісторыі Беларусі, кандыдат гістарычных навук Сяргей ТРАЦЦЯК казалі пра тое, як важна глядзець на падзеі нашай гісторыі менавіта вачыма беларусаў, пры гэтым заставацца аб'ектыўнымі і не забываць пра вынесеныя ўрокі.** СТАР. 12–13

ISSN 1990 - 763X

20179

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на IV квартал 2020 года

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

# «Нашы дзяржавы і нашы народы заўсёды будуць дружалюбныя»

**Учора, 14 верасня, у расійскім Сочы на тэрыторыі рэзідэнцыі «Бачароў ручай» адбылася сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Расіі Аляксандра Лукашэнкі і Уладзіміра Пуціна. Інфармацыя аб ёй размешчана на афіцыйным сайце кіраўніка беларускай дзяржавы.**



Фота БелТА.

Перагаворы праходзілі ў фармаце «сам-насам». Лідары краін абмеркавалі стан і перспектывы развіцця двухбаковага супрацоўніцтва ў розных сферах, тэматыку саюзных адносін, разгледзелі міжнародную праблематыку і сітуацыю ў рэгіёне, пытанні сумеснага рэагавання на выклікі.

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў расійскаму боку і асабіста Прэзідэнту Расіі Уладзіміру Пуціну за падтрымку ў поствыбарны перыяд. Кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што ў сваім уступным слове расійскі лідар адкрыта і досыць поўна закрануў пытанні цяперашняй сустрэчы ў Сочы. «Гэта правільна. Таму што як ніколі раней — я з-за пэўных абставін вельмі старанна адсочваю зараз публікацыі ў розных СМІ — столькі канспіралагічнага было напярэдадні нашай сустрэчы... Таму ўсё, што вы сказалі, вельмі важна. І яно, увогуле, адказвае на ўсе тыя выклікі і настроі ў СМІ», — сказаў ён.

«Перш за ўсё хачу вам падзякаваць. Гэта натуральна, усе гэта выдатна разумеюць. Падзякаваць не за тое, што мы выконваем дагаворы. Гэта натуральна. ***Вы паступілі вельмі прыстойна, па-чалавечы. Таму я асабіста вам дзякую і ўсім тым расіянам, хто быў датычны да таго, каб падтрымаць нас у гэты поствыбарны час»,*** — сказаў Прэзідэнт Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што сябар спазнаецца ў бядзе. «Я гэта шчыра кажу. Гэта нам урок — не толькі Беларусі і Расіі, але і нашым постсавецкім рэспублікам. Пра гэта мы будзем яшчэ гаварыць на сустрэчы ЕАЭС, АДКБ, ды і ў рамках СНД ёсць пра што пагаварыць. Думаю, вам будзе цікавая мая заява ў гэтых структурах, — сказаў Прэзідэнт. — Як мы з вамі па тэлефоне размаўлялі яшчэ ў пачатку гэтых падзей у Беларусі, што ўрокі трэба здабываць з усіх падзей. І для нас таксама вельмі сур'ёзны ўрок, які мы з вамі, спадзяюся, вытрымалі».

«Мы сапраўды па дамове АДКБ ішлі роўна і, улічваючы адносіны паміж брацкімі народамі, фактычна адным народам, мы так і зрабілі. Не ваявалі, не стралялі, не кідаліся нават палкамі. Але прадэманстравалі сваю рашучасць. Што калі там, за беларускімі межамі, камусьці хочацца пачацаць рукі, мы можам пачацаць у любы момант. І што мне вельмі прыемна, я вам вельмі за гэта ўдзячны, — вы прадэманстравалі, што беларускія межы — гэта межы Саюзнай дзяржавы. І нікому не дазволена бразгаць там зброяй», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што пры стварэнні і развіцці дамовы аб Саюзнай дзяржаве бакі ішлі планамерна, паступова. «Нашы дзяржавы і нашы народы заўсёды будуць дружалюбныя», — упэўнены беларускі лідар.

Кіраўнік беларускай дзяржавы пацвердзіў непахіснасць беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў ваеннай сферы. «Па абароне мы заўсёды прытрымліваліся з вамі, як людзі ваенныя, адной тактыкі. Я, можа быць, груба сказаў нядаўна расійскім журналістам: сабачыцца мы можам па любых пытаннях, спрачацца і гэтак далей, але абарона і бяспека ў нас ніколі не выклікалі ніякіх спрэчак і сумневаў. ***Мы ні ў кога не павінны пытацца, праводзіць ці не праводзіць у нас вучэнні.*** Мы праводзілі і будзем праводзіць. Хто-небудзь хоча, няхай далучаецца да гэтых вучэнняў, хтосьці не хоча, няхай не робіць гэтага, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я думаю, што, Уладзімір Уладзіміравіч, вы дасцё каманду міністру абароны Расіі, а наш міністр ужо атрымаў такую каманду: мы сплануем на гады наперад гэтыя вучэнні, будзем іх канкрэтызаваць. І малыя, і вялікія вучэнні мы павінны праводзіць разам».

У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы акцэнтаваў увагу на адным з урокаў цяперашняй сітуацыі ў Беларусі і вакол яе: «Ну навошта лязгаць гусеніцамі каля межаў Саюзнай дзяржавы і Беларусі (гаворка пра ваенныя манеўры заходніх краін і НАТА)? Складаны перыяд, ну пацярпіце».

Аляксандр Лукашэнка прывёў канкрэтны прыклад — перакідка на палігон Пабрадзе ў Літве у 15 кіламетрах ад дзяржаўнай мяжы амерыканскага танкавага батальёна. «Навошта гэта рабіць? Таму нам трэба не дапусціць памылак Вялікай Айчыннай вайны, калі ўсе ўціхамірвалі, што правакацый не дапусцяць, вайны не будзе і іншае... І мы апынуліся як ля разбітага карыта...»

«Таму я лічу, што нам ні ў якім разе нельга азірацца на тое, што нам скажуць. Яны з намі не лічацца. Яны не глядзяць на нашу нацсярожанасць, праводзяць вучэнні тады, калі хочуць. Таму мы таксама, калі вы падтрымаеце гэты тэзіс, не напружваючы абстаноўку вакол, будзем рыхтаваць свае арміі, каб калі, не дай бог, можна было гэтаму супрацьстаяць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Прэзідэнт Беларусі таксама выказаўся наконт пратэстаў, якія перыядычна праходзяць у краіне, і асабліва ў беларускай сталіцы, Аляксандр Лукашэнка сказаў наступнае: «Не спрашчаю, але з усмешкай гляджу на тое: у нас у суботу марш жанчын і дзяўчат, а ў нядзелю агульны марш. У звычайныя (будныя) дні краіна жыве звычайным жыццём. Ды і ў суботу і нядзелю. Частку Мінска мы вызваляем для таго, каб людзі маглі, калі ў іх ёсць жаданне, прайсціся».

***Ён падкрэсліў, што галоўнае — не пераходзіць мяжу.*** «Ёсць чырвоная лінія (вам таксама гэта знаёма і вядома больш, чым мне, вам давялося гэтыя лініі чарціць па Чачні перш за ўсё, калі вы сталі яшчэ зусім маладым прэзідэнтам). Не дай бог, вядома, гэта ў Беларусі. Але тым не менш ёсць пэўныя чырвоныя лініі, якія ніхто не мае права пераходзіць. Пакуль гэтыя чырвоныя лініі ніхто не парушаў», — дадаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што бачыць неабходнасць у больш цесным супрацоўніцтве з Расіяй, у тым ліку ў сферы эканомікі. «Эканоміка ляжыць у аснове ўсяго. І паверце, што мы заўсёды прытрымліваліся гэтай лініі. А вось гэтыя падзеі паказалі, што ***нам трэба больш цесна трымацца з нашым старэйшым братам і супрацоўнічаць па ўсіх пытаннях, у тым ліку і ў эканоміцы»,*** — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што яшчэ да прэзідэнцкіх выбараў у Беларусі яны з Уладзімірам Пуціным дамаўляліся пасля электаральнай кампаніі актыўна заняцца пытаннямі эканамічных адносін. Было прапанавана, каб у Мінск прыехаў расійскі прэм'ер-міністр з членамі ўрада, правялі перагаворы. «Каб мы зноў не наступалі на граблі, звычайна спатыкаючыся на складаных пытаннях. Так, Міхаіл Мішусцін прыехаў у Мінск, мы з ім сустракаліся. Яны вельмі добра спрацавалі па ўсіх пытаннях, якія ляжалі на паверхні. Дамоўленасцяў дасягнулі. Некаторыя пытанні мы адклалі спецыяльна для сустрэчы прэзідэнтаў, каб іх абмеркаваць і прыняць рашэнне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт не выключае, што другая хваля каранавіруса ў Еўропе будзе больш магутная, чым першая. «Што датычыцца каранавіруса, я вам удзячны, і мы гэта вельмі цэнім, што вы паставілі нас на першы радок у забеспячэнні вакцынай. Вы бачыце, што адбываецца ў Еўропе. ***Ужо адназначна пачалася моцная другая хваля. Баюся, што яна будзе больш магутная, чым першая.*** Ужо бачу гэтыя тэндэнцыі, мы адсочваем іх», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Разам з тым ён адзначыў, што ў Беларусі гэтага ўсплёску, як у шэрагу краін Еўропы, няма. «Але гэта не значыць, што мы рукі апусцілі. Мы вельмі сур'ёзна рыхтуемся да таго, каб не атрымаць гэтую хвалю. Што абнадзейвае, нашы спецыялісты, навукоўцы заўважылі: гэта вірус ужо не той. Але баюся, што гэты вірус будзе накладвацца на розныя грыпозныя вірусы, якія блукаюць тут. Таму нам з вамі нельга расслабляцца», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Кіруючая партыя Японіі абрала пераемніка Сіндзо Абэ



Лідарам Ліберальна-дэмакратычнай партыі Японіі абраны генеральны сакратар кабінета міністраў краіны Ёсіхідэ Суга, паведаміла агенцтва Associated Press. Ён атрымаў 377 галасоў, абышоўшы двух іншых кандыдатаў. Як адзначае «Бі-бі-сі», перамогу першапачаткова прадказвалі менавіта 71-гадоваму Сугу, якога лічаць набліжаным былога прэм'ера Сіндзо Абэ і верагодным прадаўжальнікам яго палітыкі. Абэ займаў пасаду кіраўніка японскага ўрада самы доўгі ў найноўшай гісторыі краіны час: ён знаходзіцца на гэтай пасадзе на працягу амаль васьмі гадоў. 16 верасня будзе праведзена яшчэ адно галасаванне ў парламенце. На думку СМІ, па яго выніках Суга будзе прызначаны прэм'ерам Японіі. Як чакаецца, ён дапрацуе на гэтай пасадзе да канца бягучага тэрміна — да выбараў у верасні 2021 года. Як піша «Бі-бі-сі», адной з самых адметных падзей апошніх гадоў з удзелам Сугі стаў яго ўдзел у працэсе перадачы ўлады імператара Акіхіта цяперашняму імператару Нарухіта. Менавіта Ёсіхідэ Суга абвясціў пра пачатак новай эры Рэйва.

## Турцыя накіроўвае ў Чорнае мора яшчэ адзін карабель разведкі

Турцыя адправіць яшчэ адзін карабель разведкі у Чорнае мора для правядзення геолагаразведвальных работ. Аб гэтым паведаміў міністр энергетыкі і прыродных рэсурсаў Фаціх Дзёнмез. «Наш марскі флот папоўніцца яшчэ адным караблём, — цытуе ТАСС запіс міністра на яго старонцы ў «Твітэры». Як вядома, 21 жніўня Эрдаган афіцыйна абвясціў, што Турцыя выявіла ў Чорным моры буйныя запасы прыроднага газу. Да 2023 года ўлады разлічваюць пачаць яго пастаўкі на ўнутраны рынак. Мяркуецца, што аб'ёмы радовішча складаюць 320 мільярдаў кубаметраў. У найбліжэйшы час, адзначыў турэцкі прэзідэнт, улады вырашаць тэхнічныя пытанні, якія датычацца здабычы газу з гэтага радовішча, і «неадкладна прыступяць да бурэння». Фаціх Дзёнмез паведамляў, што знойдзеныя ў Чорным моры запасы газу ацэньваюцца ў 65 мільярдаў долараў.

## «Краіна качэўнікаў» атрымала «Залатога льва»



Лепшым фільмам 77-га Венецыянскага кінафестывалю стала карціна «Зямля качэўнікаў» з Фрэнсіс Макдорманд у галоўнай ролі. Карціна амерыканскага кінарэжысёра кітайскага паходжання Хлоі Чжао — пераможца конкурснай праграмы, паведаміў Euronews. Урачыстая цырымонія абвяшчэння лепшых фільмаў прайшла анлайн на сайце фестывалю. Чжао і Макдорманд выйшлі ў эфір з фургона, у якім падарожнічала па Амерыцы гераіня фільма. «Сярэбранага льва Святога Марка» атрымаў мексіканскі рэжысёр Мішэль Франко за карціну «Новы парадак». Найлепшым выканаўцам жаночай ролі была прызнана брытанская актрыса Ванеса Кірбі, якая сыграла ў двух конкурсных фільмах. Яе ўзнагародзілі за ролю ў карціне «Фрагменты жанчыны» Карнэля Мундруца. Італьянец П'ерфранчэска Фавіна — найлепшы акцёр. Ён сыграў у фільме «Наш бацька» Клаўдыа Нача. Сярэбраным львом за лепшую рэжысуру адзначылі фільм японца Кіёсі Курасавы «Жонка шпіёна». А карціна расійскага рэжысёра Андрэя Канчалоўскага «Дарагія таварышы!» атрымала спецыяльную прэмію журы.

# Слова — чытачам «Звязды»

## «Калі чытаеш на роднай мове — ніколі яе не забудзеш»

Звязда. Да чытача з любоўю!



**Таццяна ГАГАКАВА, начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Брэсцкага аблвыканкама:**

— Газету чытаю шмат гадоў, яна імпануе перш за ўсё сваім асаблівым стылем падачы матэрыялаў, у якім ёсць чыста беларуская разважлівасць, стрыманасць, інтэлігентнасць.

Вельмі важна, што вы паказваеце жыццё глыбінкі. Сёння гэта, можна сказаць, свайго роду барометр жыцця. Людзі, якія вырошчваюць хлеб, штодня працуюць на зямлі, упэўнена, найбліжэйшыя да ісціны. Таму да іх меркавання трэба ўважліва прыслухоўвацца. На старонках газеты з задавальненнем праглядаю матэрыялы з самых маленькіх і аддаленых вёсак Берасцейшчыны, не пакідаю па-за ўвагай публікацый на тэмы гісторыі, культуры, адраджэння помнікаў даўніны.

І яшчэ. «Звязда», якая выходзіць кожны дзень, на мой погляд, цудоўная магчымасць падтрымліваць уласную беларускую мову: калі чытаеш на роднай мове хоць некалькі абзацаў у дзень, мову не забудзеш.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Свята ў хату

# З ХЛЕБАМ І ПЕСНЯЙ

## У старажытным мястэчку Дзівін Кобрынскага раёна аграрыі Брэстчыны адсвяткавалі Дажынкі

**Шматлікія госці, асабліва тыя, хто даўнавата не быў тут, здзіўляліся таму, як расквітнеў пасёлак, папрыгажэлі вуліцы і завулкі, памяняліся агароджы, фасады будынкаў. Дадаць сюды прыгажосць гандлёвых і выставачных павільёнаў, мноства самадзейных артыстаў у стракатых касцюмах, музыку, песні ды сотні святочна апранутых людзей... «Такога фэсту Дзівін дакладна не ведаў апошнія гадоў пяцьдзясят», — сказала староста вёскі Ніна КЛАЧКОВІЧ.**



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

*(Заканчэнне на 7-й стар.)*

# ГРОШЫ — НА РАЗВІЦЦЁ!

**Па мільёне рублёў на будаўніцтва новай школы, чатырох спортпляцовак і рэканструкцыю бальніцы. Грашовыя сертыфікаты на развіццё сацыяльнай інфраструктуры ў падарунак да свайго Дня нараджэння атрымаў Гомель.**



Фота Ганны ПАШЧАНКІ.

Горад над Сожам адзначыў 878 гадоў з моманту заснавання. Дзень горада быў распачаты канцэртам «З днём нараджэння, любімы Гомель!», які прайшоў у цэнтральным парку на набярэжнай. Гамяльчан павіншавалі **старшыня аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ і старшыня гарвыканкама Пётр КІРЫЧЭНКА.**

*(Заканчэнне на 7-й стар.)*

Блізкая ўлада

# СТАСУНКІ Ў ФАРМАЦЕ «БЕЗ ГАЛЬШТУКАЎ»

## Аб чым ішла размова кіраўніка Гродзенскага рэгіёна і моладзі каля турыстычнага вогнішча

**Кульмінацыяй турыстычнага маладзёжнага турслёта на Гродзеншчыне стала сустрэча яго ўдзельнікаў са старшынёй аблвыканкама Уладзімірам КАРАНІКАМ. «Адкрыты дыялог» выклікаў жывы інтарэс у прадстаўнікоў маладога пакалення. А галоўнае, дзяўчаты і хлопцы маглі задаць пытанні, якія іх хвалююць, выказаць ідэі і прапановы, пачуць канструктыўныя адказы.**



Фота БелТА.

— У кожнага са студэнцтва засталося ўяўленне, што гэта самы лепшы фармат для гутаркі, калі ёсць адзначне, ёсць магчымасць задаць пытанні, якія больш за ўсё хвалююць. Сучасная моладзь гэты фармат разумее лепш. Трэба ўлічваць, што гэта будучае краіны, неабходна размаўляць і на гэтай мове таксама, каб адказаць на іх пытанні і, магчыма, акрэсліць нейкія арыенціры, — адзначыў кіраўнік рэгіёна.

Між тым тэматыка пытанняў была самая разнастайная. Прадстаўнікі маладзёжнага актыву вобласці задалі пытанні, якія не толькі датычыліся актуальных праблем грамадства, але і мелі характар прапаноў. Напрыклад, прагучала ідэя арганізаваць конкурсы лепшых па прафесіі сярод моладзі. Уладзімір Каранік паабяцаў абмеркаваць гэтую тэму з прадстаўнікамі галіновых прафсаюзаў, дзе такіх конкурсаў яшчэ няма. Магчыма, аграфэст для маладых работнікаў АПК будзе арганізаваны ўжо падчас наступных Дажынак.

Пацікавіліся маладыя актывісты і развіццём турыстычнай галіны. Многія карыстаюцца «Картай госця», дзе прадугледжаны зніжкі. А вось набыць рэальную карту пакуль складана, у горадзе ўсяго некалькі месцаў, дзе яна прадаецца. Адсюль пытанне: чаму не прадаваць карту на вакзалах, аэрапортах, гандлёвых цэнтрах? Губернатар паведаміў, што такіх пунктаў продажу будзе больш, бо Брэст і Гродна часцей за іншых сустракаюцца з бязвізавымі і неарганізаванымі турыстамі, для якіх гэта карта найбольш цікавая, таму праблема будзе вырашацца.

У працяг тэмы прагучала пытанне пра турыстычны лагатып, які быў зацверджаны ў выніку леташняга конкурса, але пакуль мала выкарыстоўваецца. Моладзь прапанавала больш шырока прадставіць лагатып, у тым ліку на міжнародных мерапрыемствах.

Губернатар пагадзіўся, што да папулярызацыі лагатыпа варта далучыць малому і сярэдняму бізнесу. А ўвогуле гэта сітуацыя вырашыцца сама сабой, калі павялічыцца паток турыстаў.

Не абыйшлі ўдзельнікі сустрэчы і вострыя праблемы грамадскага жыцця. У прыватнасці, як абараніць моладзь ад фэйкаў у інтэрнэце, а таксама ад нападкаў на саюзную моладзь у тэлеграм-каналах. Уладзімір Каранік згодны з тым, што на сённяшні дзень гэта сур'ёзная праблема, бо ёсць інтэрнэт-каналы, дзе немагчыма весці нейкую дыскусію. Таму варта канкураваць з такой інфармацыяй, ствараць свае крыніцы, а навіны даваць крэатыўныя. Напрыклад, праз цікавыя мерапрыемствы, якія адлюстроўваюць сённяшняе рэальнае жыццё.

Што датычыцца нападкаў на БРСМ, гэта адбываецца таму, што ў арганізацыі ёсць аўтарытэт, таму яе кампраметуюць. Тыя, хто гэта робіць, не імкнуцца да праўды, лічыць Уладзімір Каранік, у іх ёсць эмацыянальны пасыл дыскрэдытаваць. А розумам перабіць эмоцыі немагчыма. Важна не рэагаваць, ігнараваць і рабіць далей сваю справу.

Адно з пытанняў у адкрытага мікрафона датычылася таго, як мяняюцца населеныя пункты ў рамках Года малой радзімы і што яшчэ будзе зроблена ў гэтым кірунку. Маладыя ўдзельнікі сустрэчы даведаліся, што ў вобласці вядзецца сур'ёзнае будаўніцтва аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. У прыватнасці, горад атамшчыкаў Астравец цалкам змяніў аблічча, тут вырас новы населены пункт з сучаснымі аб'ектамі. Будуюцца басейны, школы, дзіцячыя садкі, карпусы раённых бальніц, анкадыспансер. У краіне вядзецца рэалізацыя праекта «вёскі будучага», дзе значную ролю адыгрывае дзяржаўна-прыватнае партнёрства.

Прагучала добрая навіна для аматараў скейтбордынгу, ролераў і велатрыялістаў. Як паведаміў Уладзімір Каранік, адпрацоўваюцца варыянты па стварэнні ў Гродне такой пляцоўкі, прычым гэта будзе не адна лакацыя, а цэлы комплекс, дзе будуць і скаладром, і скейт-парк, і варкаўт, і нават кафэ. Дарэчы, нядаўна скейтпарк з'явіўся ў Лідзе.

Напрыканцы сустрэчы Уладзімір Каранік заўважыў, што моладзь павінна быць актыўнай, рабіць канкрэтныя прапановы наконт таго, што трэба змяніць, каб добрыя ініцыятывы хутчэй укараніць у жыццё. Усё гэта будзе адлюстравана ў нарматыўна-прававых актах, якія рыхтуюцца ў дзяржаве.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

**• У тэму**

### Мерапрыемствы «За Беларусь!» праходзяць у населеных пунктах вобласці

Члены пярвічнай прафсаюзнай арганізацыі Воранаўскага райвыканкама здзейснілі пяты велапрабег па маршруце Воранава — Тракелі. А вось у Шчучыне маладзёжны велапрабег прайшоў пад дэвізам «Я вырас тут, і край мне гэты дарагі». Маршрут пралягаў праз знакавыя гістарычныя мясціны раёна. Таксама ўдзельнікі велапрабега сустрэліся са спецыялістамі прадпрыемства «Праймілк», ветэранамі Ўзброеных сіл, педагогамі Дома творчасці. Міні-канцэрт «За любімую Беларусь» прайшоў у аграгарадку Алекшыцы Бераставіцкага раёна. Праграму падрыхтаваў раённы цэнтр культуры і народнай творчасці, а перад гледачамі выступіў ансамбль «Бераставіцкія музыкі» і ўдзельнікі аматарскай творчасці раёна.

За Беларусь!

# Вандроўка аўталэдзі

**Голас у падтрымку міра і стабільнасці прагучаў на гэты раз у Глуску, што на Магілёўшчыне. Калона машын, упрыгожаных дзяржаўнымі сцягамі, праехала па цэнтральнай вуліцы імя Кірава і накіравалася ў вёску Гарадок, дзе аўтааматаркі прынялі ўдзел у малебне аб дараванні міру і дабрабыту беларускаму народу. Багаслужэнне адбылося ў найстарэйшым храме раёна ў гонар Святых Казьмы і Дзям'яна.**

— Нашы жанчыны выступілі за мірныя адносіны, — кажа **начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глускага райвыканкама Алена САМУЙЛІК.** — Усё трэба вырашаць мірным шляхам, якіх бы поглядаў людзі ні прытрымліваліся. Канфлікты ні да чога добрага не прыводзяць. Жанчыны як маці, як ахоўніцы сям'і і спакою вельмі перажываюць за дзяцей, за сітуацыю ў краіне. Хочацца міру і спакою.

У Краснаполлі пад назвай "За Беларусь!" прайшло ўрачыстае пасвячэнне ў піянеры. Падзея адбылася на алеі Славы ў цэнтры горада. З заклікам любіць і берагчы сваю Радзіму да падлеткаў звярнуліся прадстаўнікі раённай улады, БРСМ, іншых грамадскіх арганізацый.

— Гэта адно з мерапрыемстваў, якія праходзяць у рамках святкавання 30-годдзя рэспубліканскай піянерскай арганізацыі, — адзначыла **старшы інспектар аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Краснапольскага райвыканкама Святлана ПЕТРАЧЭНКА.** — Акцэнт быў зроблены на беларускай сімволіцы, урачыстым унясенні і вынясенні дзяржаўнага сцяга, гучанні гімна.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Анонс

# Ад апошняга цара Балгарыі да першага прэм'ер-міністра Славакіі

**Сёння, 15 верасня, а 15-й гадзіне ў кнігарні «Акадэмкніга», што месціцца ў Мінску па праспекце Незалежнасці, 72, пройдзе прэзентацыя кнігі вядомай журналісткі-міжнародніцы Інэсы ПЛЕСКАЧЭЎСКАЙ «Без жалезнага занавесу».**




Зборнік з 70 гутарак, якія аб'яднаныя адной вокладкай, уражвае тым абсягам суразмоўцаў, інтэрв'ю з якімі спадарыні Інэсе ўдалося падрыхтаваць. Апошні цар Балгарыі Сімеон II, апошні Генеральны сакратар ЦК САПГ Эгон Крэнц, першы прэм'ер-міністр незалежнай Славакіі Уладзімір Меч'яр, адзін з найбуйнейшых магнатаў Румыніі Фларыян Тапеша, сусветна вядомы кінарэжысёр Кшыштаф Занусі, саліст венгерскай оперы «Амега» Янош Кабора і многія іншыя цікавыя асобы, людзі, да чыіх меркаванняў, думак у свеце прыслухоўваюцца.

У кожнага, хто наведаецца на прэзентацыю, будзе магчымасць набыць кнігу і атрымаць аўтограф у аўтара. А галоўнае — паслухаць, як рабіліся, як рыхтаваліся, як праходзілі інтэрв'ю. Несумненна, размова вакол кнігі, сустрэча з журналісткай-міжнародніцай будзе карыснай для моладзі, якая выбірае прафесію, шукае сябе ў жыцці.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Міжнароднае супрацоўніцтва

Андрэй ХУДЫК:

# «МЫ РАЗМАЎЛЯЕМ З ПАРТНЁРАМІ НА АДНОЙ МОВЕ»

## Кіраўнік Мінпрыроды расказаў пра выкарыстанне міжнароднай тэхнічнай дапамогі

**У Мінску 27 жніўня ў рэжыме анлайн адбылося VI пасяджэнне Міждзяржаўнага экалагічнага савета СНД, на якім міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі Андрэй Худык быў абраны старшынёй гэтай структуры. На пасяджэнні абмяркоўвалася шмат пытанняў, звязаных з прыродаахоўнай дзейнасцю. Кіраўнік Мінпрыроды падзяліўся з калегамі вопытам нашай краіны па прыцягненні міжнароднай тэхнічнай дапамогі для рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага прыродакарыстання.**

***— Андрэй Паўлавіч, колькі дзеючых прыродаахоўных праектаў маюць міжнародную тэхнічную падтрымку?***

— Міністэрства мае шматгадовы вопыт супрацоўніцтва з міжнароднымі донарамі для вырашэння прыродаахоўных задач. Зараз мы рэалізуем 12 праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі з агульным бюджэтам больш за 30 млн долараў ЗША і 11 млн еўра, што дазваляе нарошчваць патэнцыял краіны, распрацоўваць праекты нарматыўных прававых актаў з улікам міжнароднага вопыту, закупляць неабходнае абсталяванне, праводзіць мерапрыемствы, накіраваныя на выкананне прынятых міжнародных абавязацельстваў.

Адзначу, што наша краіна, пераймаючы перадавыя практыкі прававога рэгулявання рацыянальнага выкарыстання прыродных рэсурсаў, удасканальвае сваё заканадаўства. Гэта вельмі важна ў тым ліку для міжнароднага супрацоўніцтва — мы размаўляем з партнёрамі на адной мове.

***— Раскажыце пра найбольш важныя, на ваш погляд, праекты, якія атрымалі міжнародную тэхнічную дапамогу.***

— Яны ўсе важныя і цікавыя. Давайце пачнём з тых, якія датычацца кожнага чалавека. Адходы на сённяшні дзень з'яўляюцца адной з найбольш важных экалагічных праблем ва ўсім свеце, паколькі іх назапашванне нясе пагрозу як для насельніцтва, так і для навакольнага асяроддзя.

У рамках выканання Стакгольмскай канвенцыі Мінпрыроды на пастаяннай аснове праводзіцца мэтанакіраваная работа па прыцягненні міжнародных сродкаў для арганізацыі экалагічна бяспечнага абыходжання са стойкімі арганічнымі забруджвальнікамі.

Так, у 2018 годзе Беларусь атрымала фінансаванне Глабальнага экалагічнага фонду для рэалізацыі двух буйнамаштабных праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі на агульную суму звыш 12 млн долараў ЗША. Дзякуючы прыцягнутаму фінансаванню плануецца знішчыць звыш 2 тыс. тон небяспечных адходаў, у склад якіх уваходзяць поліхлараваныя біфенілы, і амаль 2 тыс. тон непрыдатных пестыцыдаў. За гэтыя ж сродкі плануецца стварыць аб'ект экалагічна бяспечнага знішчэння стойкіх арганічных забруджвальнікаў і іншых небяспечных адходаў у адным з рэгіёнаў краіны. Увод у эксплуатацыю такога аб'екта дасць магчымасць сістэмна вырашыць праблему абыходжання стойкіх арганічных забруджвальнікаў у Беларусі, а таксама ў перспектыве знішчаць усе шкодныя рэчывы.


Фота прэс-службы Мінпрыроды.
Андрэй ХУДЫК.

***— А што можна сказаць аб супрацоўніцтве Мінпрыроды і міжнародных структур дзеля прасоўвання аднаўляльнай энергетыкі?***

— Лічу, што мы дастаткова паспяхова ўзаемадзейнічаем у гэтым кірунку з Еўрапейскім саюзам і Глабальным экалагічным фондам. Дзякуючы сумеснай рабоце была ўсталявана ветратурбіна магутнасцю 2,5 мегавата, а таксама ўпершыню быў праведзены аўкцыён па рэалізацыі перадынвестыцыйнага актыву на будаўніцтва і эксплуатацыю сямі ветраэнергетычных установак сумарнай магутнасцю 25 мегават і гадавым аб'ёмам генерацыі 72 гігаваты. Пакупніком выступіла буйная турэцкая кампанія, якая спецыялізуецца на рэалізацыі праектаў у сферы «зялёнай» энергетыкі. Мяркуемы аб'ём інвестыцый складзе 50 млн долараў ЗША.

Мы змаглі на практыцы прадэманстраваць эфектыўнасць сучаснага ветраэнергетычнага абсталявання, прыцягнуць увагу і ўзмацніць давер да ветраэнергетычных праектаў, у тым ліку прыватных інвестараў, а таксама павысіць інфармаванне грамадскасці ў галіне аднаўляльных крыніц энергіі.

***— Ці мяркуецца ўдзел грамадскіх арганізацый у праектах з міжнароднай тэхнічнай дапамогай?***

— Вядома. Мы зацікаўлены ва ўзаемадзеянні з экаактывістамі. У прыватнасці, пры рэалізацыі праекта, накіраванага на паляпшэнне якасці маніторынгу выкідаў у атмасфернае паветра, мы прыцягнулі грамадскасць да ўдзелу ў экалагічным маніторынгу. На гэты праект у 2016 годзе былі атрыманы ад Еўрасаюза 14,5 млн еўра. Сродкі выкарыстоўваліся для мадэрнізацыі інфраструктуры маніторынгу якасці атмасфернага паветра, набыцці абсталявання для падпарадкаваных арганізацый Мінпрыроды, а таксама для «зялёных» школ. Усё гэта ў комплексе дазваляе забяспечыць на-

Еўрапейскі тыдзень мабільнасці

# Няхай аўтамабілі адпачнуць

## У Беларусі да акцыі далучылася больш за 60 населеных пунктаў


kto-chto-gde.ru

**Штогод з 16 да 22 верасня праводзіцца Еўрапейскі тыдзень мабільнасці. Гэтая акцыя нагадвае пра негатыўны ўплыў аўтамабіляў на навакольнае асяроддзе і заахвочвае людзей карыстацца альтэрнатыўнымі сродкамі перамяшчэння.**

Сярод забруджвальнікаў атмасфернага паветра першае месца займаюць выкіды ад аўтатранспарту. Яны ўтрымліваюць шмат рэчываў, шкодных для здароўя людзей і навакольнага асяроддзя. Калі нават чаcтка кіроўцаў адмовіцца ад аўтамабіляў хоць бы на адзін дзень, паветра гарадскіх вуліц стане крыху чысцейшае.


pozdravik.com

Кожны раз Еўрапейскі тыдзень мабільнасці засяроджваецца на пэўнай тэме, звязанай з устойлівай мабільнасцю. Сёлета абвешчана тэма: «Мабільнасць без шкодных выкідаў» пад слоганам «Выбірай, на чым перамяшчацца!» Стымулююцца прагулкі на роварах і пехатой, а таксама карыстанне грамадскім транспартам з нізкім узроўнем або адсутнасцю шкодных выкідаў.

Зараз у Еўрапейскім тыдні мабільнасці ўдзельнічаюць 2306 гарадоў з 41 краіны. У Беларусі да акцыі далучыліся 63 населеныя пункты. Наша сталіца бярэ ў ёй удзел пяты раз.

Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя распрацаваў план мерапрыемстваў Еўрапейскага тыдня мабільнасці ў Мінску, у тым ліку гарадской экалагічнай акцыі «Дзень без аўтамабіля».

— Сумесна з Цэнтрам экалагічнага выхавання і развіцця будзе адкрыты веламаршрут па экасцежках у Заводскім і Ленінскім раёнах сталіцы.

— Пройдзе выстаўка «Транспарт 100 гадоў таму», якая будзе прапагандаваць беражлівае стаўленне да гарадскога асяроддзя і персанальныя экалагічныя сродкі перамяшчэння (ровары, самакаты, электратранспарт).

— Традыцыйнай стане акцыя «На работу — на ровары!». У шасці месцах горада веласіпедзісты змогуць бясплатна пачаставацца гарбатай, кавай, садавінай і атрымаць інфармацыйныя матэрыялы пра Еўрапейскі тыдзень мабільнасці.

— 21 і 22 верасня на вуліцах Мінска будуць зроблены эксперыментальныя замеры канцэнтрацыі рэчываў-забруджвальнікаў у атмасферным паветры і ўзроўню шуму.

— Фінальным этапам Еўрапейскага тыдня мабільнасці стане Дзень без аўтамабіля, які праводзіцца ва ўсім свеце 22 верасня. У гэты дзень, адпаведна рашэнню Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў № 226 от 29 ліпеня 2020 года, уладальнікі асабістых аўтамабіляў змогуць бясплатна скарыстацца наземным грамадскім транспартам і метрапалітэнам. Але ім трэба абавязкова мець пры сабе пасведчанне кіроўцы і тэхнічны пашпарт на аўтамабіль.

— Таксама 22 верасня адбудзецца велапрабег, прысвечаны Дню без аўтамабіля, з удзелам прадстаўнікоў кіраўніцтва Мінгарвыканкама і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

У межах акцыі выконваюцца работы для паніжэння бартавога каменя ў месцах з найбольш інтэнсіўным веласіпедным рухам і ўладкаванне велапарковак.

Еўрапейскі тыдзень мабільнасці будзе шырока асвятляцца ў сродках масавай інфармацыі. Адпаведныя мерапрыемствы пройдуць у навучальных установах. Цікавыя падзеі рыхтуюцца ў кожным раёне сталіцы.

Магчыма, дзякуючы акцыі некаторыя аўтааматары задумаюцца, ці неабходны ім штодня персанальны транспарт. Насамрэч для паездак па горадзе больш танным і зручным варыянтам могуць стаць метро, электробус ці ровар. А на кароткія адлегласці карысна прайсціся пешшу.

**Зараз у Еўрапейскім тыдні мабільнасці ўдзельнічаюць 2306 гарадоў з 41 краіны. У Беларусі да акцыі далучылася больш за 60 населеных пунктаў. Наша сталіца бярэ ў ёй удзел пяты раз.**

Увогуле ж Еўрапейскі тыдзень мабільнасці — добрая нагода, каб болей шпацыраваць і займацца бавіць вольны час, пакуль прырода адорвае нас бабіным летам. Давайце падтрымаем міжнародную акцыю і 22 верасня пакінем аўтамабілі ў гаражах. Зробім свядомы крок да паляпшэння гарадскога асяроддзя!

**Святлана ІШЧАНКА.**

# НА АДНОЙ МОВЕ»

## тэхнічнай дапамогі

сельніцтва аб'ектыўнай і актуальнай інфармацыяй пра стан якасці паветра.

***— Сярод прыродных багаццяў Беларусі — рэкі, азёры і балоты. Ці выдзяляецца на іх міжнародная тэхнічная дапамога?***

— Наша краіна па праве з'яўляецца адным з сусветных лідараў па аднаўленні балот. Пачынаючы з 2007 года Мінпрыроды сумесна з міжнароднымі донарамі рэалізуе пяць буйнамаштабных праектаў на агульную суму больш за 12,5 млн долараў ЗША ў галіне ўстойлівага кіравання водна-балотнымі ўгоддзямі, што дазволіла аднавіць амаль палову са 190 тыс. гектараў дэградаваных і неэфектыўна асушаных лясных тарфянікаў. Дзякуючы гэтым мерапрыемствам Беларусь зможа прадухіліць выкіды ў атмасферу амаль 5,5 тоны вуглякіслага газу за 20-гадовы перыяд, што ў перспектыве дасць магчымасць выйсці на стварэнне вугляроднага рынку ў краіне.

Нагадаю, што ў Водны кодэкс Беларусі былі ўключаны басейнавы прынцып і прынцып комплекснага кіравання воднымі рэсурсамі, у тым ліку для пяці асноўных трансгранічных рачных басейнаў: Заходняя Дзвіна, Нёман, Заходні Буг, Прыпяць і Дняпро. Распрацаваць і ўкараніць названыя прынцыпы стала магчыма дзякуючы праекту міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Водная Ініцыятыва ЕС плюс для краін Усходняга Партнёрства (BIEC +)». Пры яго рэалізацыі ў перыяд з 2017 да 2020 года арганізаваны работы Прыпяцкага і Дняпроўскага басейнавага савета, распрацаваны і зацверджаны план кіравання рачным басейнам Дняпра, а таксама распрацаваны план для рачнога басейна Прыпяці.

***— А якімі бачацца перспектывы? Ці распрацоўваюцца зараз праекты, накіраваныя на атрыманне міжнароднай тэхнічнай дапамогі?***

— У падрыхтоўчай стадыі шэраг праектаў. Сярод іх — кіраванне прэснаводнымі экасістэмамі міжнароднага значэння і паверхневымі і падземнымі водамі ў трансгранічных рачных басейнах рэк Буг і Нёман; развіццё электратранспарту; кіраванне выведам з абарачэння азонаразбуральных рэчываў і іншыя. На іх рэалізацыю спатрэбіцца 11 млн долараў ЗША.

Сумесна з ПРААН вядуцца перагаворы з Траставым фондам ПРААН—Расія па фінансаванні праекта «Аднаўленне парушаных тарфянікаў у Беларусі» з бюджэтам 5 млн долараў ЗША. У нас адносна вялікія падыходы з нашымі партнёрамі, мы добра разумеем, што прыродаахоўная дзейнасць — наш агульны клопат.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ.**

Вострая тэма

# НЕ ПРЫКРЫВАЦЦА КАРАНАВІРУСАМ

## Мінпрыроды і Камітэт па выкананні Орхускай канвенцыі выступаюць за ўсеагульную даступнасць грамадскіх абмеркаванняў

**Сёлета паўстала пытанне, як праводзіць грамадскія абмеркаванні падчас неспрыяльнай эпідэмічнай абстаноўкі. Была прапанова перайсці ў фармат відэаканферэнцый, аднак яна не знайшла падтрымкі з боку Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, а пазней і Камітэта па выкананні Орхускай канвенцыі.**

На думку Мінпрыроды, правядзенне грамадскіх абмеркаванняў праектаў, экалагічна значных рашэнняў, дакладаў па стратэгічнай экалагічнай ацэнцы, справаздач аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў фармаце відэаканферэнцый абмяжоўвае заканадаўча замацаванае права грамадскасці на ўдзел у дыскусіях. Бо далёка не кожны зацікаўлены чалавек мае адпаведныя навыкі або тэхнічную магчымасць для ўдзелу ў абмеркаваннях па відэасувязі. А значыць, будуць парушаныя правы гэтых людзей, што супярэчыць дзеючаму заканадаўству.

У гэтай сувязі Мінпрыроды раіць у выпадку неабходнасці арганізацыі сходаў у рамках грамадскіх абмеркаванняў дзеля стабілізацыі эпідэміялагічнай сітуацыі ў свеце праводзіць мерапрыемствы, кіруючыся рэкамендацыямі санітарна-эпідэміялагічных службаў Міністэрства аховы здароўя.

Пазіцыю Мінпрыроды падтрымаў Камітэт па выкананні Орхускай канвенцыі, які 2 верасня прыняў заяву аб прымяненні канвенцыі як падчас пандэміі COVID-19, так і ў наступнай фазе аднаўлення эканомікі.

У сваёй заяве Камітэт па выкананні Орхускай канвенцыі выказаў заклапочанасць тым, што яе ўдзельнікі могуць паспрабаваць апраўдаць абмежаванні правоў, гарантаваных Канвенцыяй, спасылкай на пандэмію COVID-19 або неабходнасць хуткага аднаўлення эканомікі з-за наступстваў пандэміі.

**Камітэт выразна дае зразумець, што нават ва ўмовах крызісу, такога як пандэмія COVID-19, і наступнай фазы аднаўлення эканомікі абавязковыя правы, прадугледжаныя Канвенцыяй, не могуць быць зменшаны або абмежаваны.**

Камітэт таксама нагадвае бакам Канвенцыі, што любыя недахопы ў забеспячэнні эфектыўнага доступу да інфармацыі, удзелу грамадскасці ў прыняцці рашэнняў або доступу да правасуддзя ў адпаведнасці з Канвенцыяй падчас пандэміі COVID-19 або на наступнай фазе эканамічнага аднаўлення могуць быць аспрэчаныя ў адпаведнасці з палажэннямі артыкула 9 Канвенцыі.

**Маргарыта ДРАЗДОВА.**

### ❍ Даведка:

Беларусь з'яўляецца Бокам Орхускай канвенцыі — канвенцыі Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН «Аб доступе да інфармацыі, удзеле грамадскасці ў прыняцці рашэнняў і доступе да правасуддзя па пытаннях, што датычацца навакольнага асяроддзя», якая зацверджана ў нашай краіне Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 снежня 1999 года № 726.

Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

# ЗЯМЛЯ НА ВАГУ ЗОЛАТА

## Сёлета завяршаецца перыяд дзеяння Нацыянальнага плана па прадухіленні дэградацыі зямель

**Ад дэградацыі глебаў пакутуе амаль палова жыхароў планеты. Паводле ацэнак ААН, да 2045 года каля 135 мільёнаў чалавек пакінуць родныя мясціны ў выніку апустыньвання. А што робіцца ў нашай краіне, каб вырашыць гэтую праблему?**

### Чаму «псуюцца» глебы?

Па словах спецыялістаў, з 2012 года аднавілася зімовае пацяпленне (яно апошні раз назіралася з 1960 да 1990 года, пасля чаго змянілася на летняе). Зімы сталі больш цёплыя і амаль бясснежныя. Гэта прывяло да пагаршэння ўвільгатнення глеб і харчавання падземных водаў, зніжэння запасаў пэрадвясенніх і ўзроўню грунтавых водаў. Ужо ранняй вясной мы назіраем засухі. Дарэчы, як падкрэсліў **дырэктар Інстытута прыродакарыстання НАН Беларусі Сяргей ЛЫСЕНКА**, узровень грунтавых водаў за апошнія некалькі гадоў панізіўся нават больш, чым за ўвесь перыяд асушальнай меліярацыі мінулага стагоддзя.

— Гэта зіма была самая цёплая за ўсю гісторыю метэаназіранняў — яна на 5,5 градуса перавысіла кліматычную норму. А такога сухога красавіка, як у 2019 годзе, на тэрыторыі Беларусі не было ні разу за пасляваенны перыяд. Што датычыцца красавіка гэтага года, то, напрыклад, у разгар пасяўнога сезона ў Гомельскай вобласці выпала рэкордна нізкая колькасць ападкаў — усяго 7,9 мм, што складае 19 % ад нормы, — дадаў **намеснік начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Андрэй КУЗЬМІЧ.**

Да таго ж бясснежная зіма ўзмацніла ветравую эрозію, або дэфляцыю. Асабліва гэта прыкметна ў паўднёвай частцы, на Палессі, дзе распаўсюджаны лёгкія пясчаныя і супясчаныя, а таксама тарфяныя глебы. Таму сёлета Белгідраметам было зарэгістравана каля 10 пыльных бур — што больш, чым звычайна. Такія буры прыводзяць да пераносу верхняга, найбольш урадлівага пласта глебы. У выніку колькасць арганічнага рэчыва ў зямлі паніжаецца. Акрамя таго яны могуць выдзімаць насенне і нават расліны, якія ўкараніліся ў зямлі. Шматгадовыя назіранні сведчаць: на пацярпелых ад эрозіі глебах паніжэнне ўраджаю збожжавых і зернебабовых культур складае ад 10 да 40 %.

— Мінсельгасхарч сумесна з навукоўцамі падрыхтаваў цэлы комплекс мерапрыемстваў для вырашэння гэтай праблемы. Напрыклад, мы прапануем на схільных да ветравой эрозіі землях замест яравых культур сеяць азімыя. Гэта дазволіць пазбегнуць вясновых засух і пыльных бур. Каля 50 % дэфляцыі глебы назіраецца менавіта з сакавіка да мая, а калі палі засеяныя і культуры знаходзяцца ў актыўнай фазе вегетацыі, гэтага не адбываецца, — адзначыў **намеснік дырэктара па навуковай рабоце Інстытута глебазнаўства і аграхіміі НАН Беларусі Мікалай ЦЫБУЛЬКА.**

### ❍ Факты і лічбы

У 2019 годзе праведзена экалагічная рэабілітацыя ўчасткаў парушаных тарфянікаў на плошчы больш за 2,7 тыс. га і лесааднаўленне на месцах лясных пажараў на плошчы 276 га, рэкультываваны 221 унутрыгаспадарчы кар'ер агульнай плошчай больш за 192 га. Для падтрымання ўрадлівасці глеб сельскагаспадарчых зямель унесены больш за 49 млн тон арганічных угнаенняў. Пашыраецца выкарыстанне тэхналогіі дакладнага земляробства пры ўнясенні мінеральных угнаенняў і сродкаў аховы раслін, што дазваляе мінімізаваць паступленне хімічных рэчываў у глебу.



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

### Далейшыя планы

Па словах Андрэя Кузьміча, сёлета завяршаецца перыяд дзеяння Нацыянальнага плана па прадухіленні дэградацыі зямель. Таму зараз рыхтуецца аналагічны план да 2025 года, які будзе ўлічваць як вынікі ўжо праведзенай работы, так і кліматычныя змены.

— Будучыя мерапрыемствы павінны спрыяць затрыманню вады і ўзняццю ўзроўню грунтавых водаў. Гэтаму будзе садзейнічаць у тым ліку паўторнае забалочванне тарфянікаў, на якіх далейшая сельска- ці лесагаспадарчая дзейнасць прызнана неэфектыўнай. Таксама плануецца аднаўляць практыку стварэння полеахоўных насаджэнняў. Яшчэ 50 гадоў таму іх у краіне было каля 7,5 тыс. га, а цяпер, па экспертных ацэнках, засталося не больш за 1,5 тыс. га. Вядома, на першым этапе гэта будзе затратна, але ў перспектыве дасць як экалагічны эфект, таму што зменшыць ветравую эрозію глебаў, так і эканамічны за кошт захавання пасеваў і павелічэння ўраджаю, — адзначыў спецыяліст.

Таксама ў 2020 годзе прадугледжана паўторнае забалочванне тарфянікаў на тэрыторыі не менш за 2 тыс. га ў Хойніцкім і Калінкавіцкім раёнах Гомельскай вобласці. Гэта работа будзе выканана пры падтрымцы ўрада Рэспублікі Карэя і Канвенцыі ААН па барацьбе з апустыньваннем у рамках другой фазы праекта «Аднаўленне асушаных тарфянікаў у Беларусі».

Акрамя таго, плануецца завяршыць пачаты раней працэс экалагічнай рэабілітацыі тарфянікаў «Бярозавік» у Смаргонскім і Вілейскім раёнах і «Жада» ў Шаркаўшчынскім і Мёрскім раёнах у рамках праекта ПРААН ГЭФ «Ветландс».

**Маргарыта САКАЛОВА.**

# ПАРК НЕВЯДОМАГА ПРЫЗНАЧЭННЯ



## ЦІ СПАРТЫЎНЫ ГАРАДОК?

Наш чытач — трэнер-інструктар па баявых мастацтвах, без заняткаў спортам у яго і дня не праходзіць. Былы афіцэр зараз на пенсіі і перадае свой спартыўны вопыт моладзі. Амаль 30 гадоў, з той пары як пасяліўся ў Магілёве, ён разам са сваімі вучнямі наведвае парк для падтрымання формы — там заўсёды была спартыўная пляцоўка. І калі раней пытанняў да яе стану не ўзнікала, то апошнім часам іх ужо зашмат. Ён першы, хто выказаў клопат, калі спартыўныя прылады спілавалі, і менавіта па яго настойлівых зваротах потым пачалі аднаўляць. Але па прынцыпе — абы адчапіцца.

— У адным месцы сумясцілі ўсё — спартыўную пляцоўку, дзіцячую зону, месцы для адпачынку і выгулу сабак, — кажа Юрый Сязёмін. — Я сапраўды прасіў, каб парку не толькі вярнулі спартыўную пляцоўку, але і абсталявалі асобнае месца для сабак, бо ім сапраўды трэба дзесьці гуляць.

Куток, куды прывёў мяне чытач, сапраўды шматфункцыянальны. Здалёк бачу, як каля шведскай сценкі гарэзіць дарослы лабрадор. Павадок яго вісіць на адным са спартыўных снарадаў. Вакол невялічкага пятачка стаіць шэсць лавак. На адной з іх сядзяць пажылыя жанчыны, каля іх круціцца французскі бульдог. Кампазіцыю завяршае вялікі кветнік збоку. Калі шчыра, мне цяжка ўявіць, як тут наогул можна адточваць прыёмы каратэ.

— Трох трэнажораў недастаткова, да таго ж яны малаэфектыўныя, — пацвярджае мае думкі суразмоўца. — Патрэбныя яшчэ брусы, прыстасаванні, каб мацаваць прэс.

Юрый Сязёмін спадзяецца таксама, што атрымаецца і аднавіць футбольнае поле, якіх тут раней было два.

— Вароты зрэзалі, зараз ад гэтых пляцовак засталіся адны контуры, — уздыхае ён.

Таксама ён звяртае ўвагу на пешаходную зону. Гэта вузенькая сцяжынка, якая ніколі не ведала, што такое асфальт. Для Юрыя Сязёміна яна яшчэ і бегавая сцяжынка. Па яго падліках, гэтая траса па перыметры складае каля чатырох кіламетраў.

## ТРАВА ПА ПОЯС

У канцы 90-х гадоў парк імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка і суседні з ім пляж каля Святога возера былі самымі запатрабаванымі месцамі адпачынку ў Задняпроўі. Аднойчы з'явілася інфармацыя, што вада ў возеры сапсавалася, патрэбны вялікія грошы для яго ачысткі. А пакуль не пачысцяць, купанне пад забаронай. Што датычыцца парку, то цікавасць да яго цалкам знікла пасля таго, як з'явіўся іншы — у Падніколлі, які за вельмі кароткі тэрмін стаў глянцавым. Але жыхары Задняпроўя па-ранейшаму наведваюць свой парк. На жаль, паркам гэта месца можна лічыць умоўна, праз стыхійны рост дрэў, кустоўя і травы на плошчы 90 гектараў. Юрый Сязёмін спецыяльна запрасіў прайсціся з ім, каб засведчыць усе наяўныя факты безгаспадарчасці. З боку дарогі траву выкасілі, але мой спадарожнік сведчыць, што гэта было зроблена толькі пасля яго неадназовых зваротаў у розныя інстанцыі. Кажа, што, калі з яго падачы на месца падзей выехалі прадстаўнікі Міністэрства аховы прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя, над навядзеннем парадку тут працавала адначасова тры адзінкі тэхнікі. Ён перыядычна дастае са свайго кейса фота, каб я магла параўнаць, як было раней. Вельмі ўражвае здымак, дзе ён стаіць амаль па плечы ў траве.

Сапраўды, па меры таго, як пачынаеш заглыбляцца ў парк, ён усё больш выглядае дзікім. Маладыя дрэўцы сапраўды падобныя на сухія пруты і вельмі жаласна выглядваюць з травяных зараснікаў. Нават непераборлівыя ліпы загінулі. Што самае непрыемнае, на гэтых прасёлачных сцяжынках можна непрыкметна наступіць на сабачую нечаканасць. А вось таблічак, што выгул сабак тут забаронены, я так і не заўважыла. Не было іх, дарэчы, і на так званай спартыўнай пляцоўцы.

## ПА КІМ ПЛАЧА ВОЗЕРА

Першае, што кідаецца ў вочы, гэта чарот, які пакрыў частку прыбярэжнай пляжнай зоны, у тым ліку лягушатніка, дзе так любілі купацца дзеці. З супрацьлеглага боку пясчанай паласой спакушаецца трава. Раней, калі пясок топталі сотні ног, нават і намёку на яе не было. Але лежачы стаяць, і на інфармацыйным стэндзе, акрамя ўлётак з інфармацыяй, што купацца забараняецца, размешчаны... парады купальшчыкам.

— Кожнае лета пляж рыхтуюць да сезона, адкрываюць на тры дні, а затым закрываюць, — тлумачыць гэты парадокс Юрый Сязёмін. — Маўляў, санслужба не дазваляе тут купацца. У выніку возера не даглядаецца і пакрысе пераўтвараецца ў балота.

Нягледзячы на тое, што пляж пад забаронай, ён усё яшчэ не выглядае цалкам закінутым. Тут і фантанчыкі, і стацыянарныя прыбіральні, і нават рэстаран-карабель, які таксама з-за недахопу кліентаў прыйшоў у заняпад. Вось ужо некалькі разоў запар ён выстаўляецца на аўкцыён. Апошні, дарэчы, адбудзецца 15 верасня.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## Каментарый у тэму

**Намеснік генеральнага дырэктара Магілёўскага ўпраўлення камунальных прадпрыемстваў Дзяніс КОЙДА:**

— Добраўпарадкаванне гэтага парку плануецца, але тут усё залежыць ад фінансаў. Калі яны знойдуцца ў гарадскім бюджэце, у парку з'явяцца і пешаходныя дарожкі з пліткі, і дзіцячая пляцоўка, і асобна спартыўная. Але спадзяванняў на тое, што ён трапіць у план на наступны год, вельмі мала.

Возера таксама трэба даводзіць да ладу. Яго неабходна цалкам чысціць ад глею, а гэта зноў-такі грошы. Трэба рабіць праект і працаваць непасрэдна ў адпаведнасці з ім. Калі будуць сродкі, мы выступім заказчыкамі праекта. Іх жа таксама яшчэ трэба знайсці ў бюджэце. Чарот каля прыбярэжнай зоны мы косім, але толькі зімой, калі возера пакрываецца лёдам. Сёлета зіма была цёплая і не было магчымасці пакасіць гэтую расліннасць. Сам пляж штогод рыхтуецца да купальнага сезона. Загараць там можна, а вось купацца забараняецца, гэта небяспечна для здароўя.

Што датычыцца пляцоўкі для выгулу сабак, то ў парку яе быць не павінна. У нас зацверджаны цэлы пералік пляцовак, дзе могуць гуляць хатнія гадаванцы. Найбліжэйшая да бульвара Непакораных — паміж Спаса-Праабражэнскім храмам і аўтастанкай па вуліцы Габраўскай. Яна агароджана кустоўем па перыметры, там ёсць сметнікі. На сайце нашага прадпрыемства і ЖРЭУ ёсць інтэрактыўныя карты, дзе схематычна паказаны пляцоўкі для выгулу сабак. У парку ж гэта забараняецца.


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| Продавец | **Червенское районное потребительское общество, Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Ленинская, 32** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46** |
| Адрес ЭТП | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** (одним лотом) **Адрес: Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Барыкина, д. 56** | | | |
| **Здание конторы** | Здание административно-хозяйственное | 125,6 кв. м | 615/С-40714 |
| **Холодильник** | Здание нежилое | 356,3 кв. м | 615/С-16068 |
| Составные части и принадлежности: навес, рампа-навес, рампа, уборная | | | |
| **Бондарный цех** | Здание нежилое | 416,4 | 615/С-16060 |
| **Квасильно-засолочный цех** | Здание нежилое | 317,6 | 615/С-16061 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, уборная | | | |
| **Гараж** | Здание нежилое | 189,2 | 615/С-16063 |
| **Овощехранилище** | Здание нежилое | 1161,5 | 615/С-16065 |
| **Здание котельной** (в т.ч. котел) | Здание специализированное коммунального хозяйства | 29,8 | 615/С-40715 |
| **Торгово-распределительные склады** | Здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ | 2515,6 | 615/С-40716 |

***В состав лота входит следующее оборудование:***
1.1. Оборудование торгово-распределительных складов: сплитсистема ККХА АПК-2ЕС-3.2/25МРН-45; холодильные камеры КХ-14.1 с агрегатом АГК-13/25-22 РН, КХ-22.0 с агрегатом АГК-13/25-22 РН, КХ-23.87 с агрегатом АГК-13/25-22 РН, КХ-23.87 с моноблоком, КХ-16.7 с моноблоком; конвейер ленточный наклонный; две камеры профильные холодильные 0.08 КХ-038;
1.2. Оборудование бондарного цеха: две холодильные камеры КХ-77.1 с агрегатом АК-ZF-13.25; сплитсистемы ККХА АПК-4С20.8/29МОН-45 и ЛКХА АПК-4С20.8/29МРП-45

***Сведения о земельном участке***: пл. **1,7050 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания базы оптово-розничного торгового объединения. Ограничения (обременения): охранные зоны объектов газораспределительной системы (пл. 0,0432 га)

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 868 809,01 бел. руб.** (снижена на 42,47 %)

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Лот № 2 Адрес: Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Горбачева** | | | |
| **Здание магазина № 15** | Здание специализированное розничной торговли | 145,3 | 615/С-16190 |
| Составные части и принадлежности: склад, котельная, сарай, туалет, пункт приема стеклотары | | | |

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0698 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации объектов торговли

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 47 975,00 бел. руб.** (снижена на 23 %)

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Лот № 3 Адрес: Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Н. Зеневича, д. 55** | | | |
| **Кондитерский цех** | Здание специализированное для общественного питания | 702,2 | 615/С-40996 |
| Составные части и принадлежности: пристройка – литера Б1/бл, сарай – литера 1, сарай – литера 2, пристройка – литера 3, сторожка – литера 4, уборная – литера 5 | | | |

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,4314 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования участок для обслуживания строений и сооружений кондитерского цеха . Ограничения (обременения): охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,0065 га), линий электропередачи напряжением до 1000 вольт (пл. 0,0416 га), сетей и сооружений канализации (пл. 0,0615 га) и теплоснабжения (пл. 0,0167 га)

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 451 359,86 бел. руб.** (снижена на 35,2 %)

**Лот № 4** (одним лотом) **Адрес: Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Чапаева, д. 21**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Здание ресторана «Волма»** | Здание специализированное для общественного питания | 872,4 кв. м | 615/С-37378 |
| **Здание склада** | Здание специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ | 230,6 кв. м | 615/С-41033 |
| Составные части и принадлежности: две пристройки | | | |

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,1689 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации объектов розничной торговли. Ограничения (обременения): охранные зоны сетей и сооружений теплоснабжения (пл. 0,0270 га), объектов газораспределительной системы (пл. 0,0014 га), электрических сетей напряжением до 1000 вольт (пл. 0,0180 га)

**Начальная цена лота № 4 с НДС 20 % – 386 633,61 бел. руб.** (снижена на 35,2 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 15** рабочих дней после снятия продавцом зарегистрированных обременений по предмету аукциона в установленном законодательством Республики Беларусь порядке

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Часть денежных средств (лот № 1 – 700 000,00 бел. руб., лот № 2 – 43 200,00 бел. руб., лот № 4 – 360 000,00 бел. руб.) оплачивается в течение 20 (двадцати) календарных дней с момента подписания протокола о результатах открытого аукциона на расчетный счет ГУЮ Миноблисполкома (для снятия запрета, установленного ОПИ), оставшаяся сумма с учетом ранее внесенного задатка оплачивается в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи)

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 20.08.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов 29.09.2020 в 11.00. Окончание торгов 29.09.2020 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 28.09.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703** |
| Продавец | **ОАСО «Би энд Би иншуренс Ко», г. Минск, ул. Я. Коласа, 38** |

**Предмет аукциона**

**Лот № 1**

**Офисная мебель и оргтехника в составе 437 единиц:** ПЭВМ, коммутаторы, кондиционеры, счетчики банкнот, копировальные аппараты, пожарная сигнализация, источники бесперебойного питания, компьютерная сеть, система симметричной связи, счетно-денеж. машинки, мебель, кабельная телефонная линия, системы вентиляции и кодиционирования воздуха, сейфы, комплекты перегородок, аппарат нагрева-охлаждения воды, рольшторы (полный перечень см. на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Начальная цена лота № 1 (с НДС 20 %) – 233 283,60 бел. руб. Шаг аукциона – 11 664,18 бел. руб.**

**Лот № 2 (одним лотом)**
Местоположение – **Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, направление ТЭЦ-4, 3-й пер. Монтажников**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер | Адрес (номер дома) |
|---|---|---|---|
| **Изолированное помещение № 1** (производственное помещение) | 206,3 кв. м | 600/D-91728 | 3А-4 |
| **Изолированное помещение № 2** (административное помещение) | 221,7 кв. м | 600/D-91729 | 3А-4а |
| **Изолированное помещение № 3** (производственное помещение) | 288,4 кв. м | 600/D-91730 | 3А-4б |
| **Административное помещение** | 233,6 кв. м | 600/D-40239 | 3-5 |
| **Административное помещение** | 83,9 кв. м | 600/D-40241 | 3-6 |
| **Складское помещение** | 205,2 кв. м | 600/D-40243 | 3-7 |

Обременение: площади помещений частично сданы в аренду (с информацией можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by)

**Начальная цена лота № 2 (с НДС 20 %) – 1 968 000,00 бел.руб. Шаг аукциона – 98 400,00 бел. руб.**

**Лот № 3**
Местоположение – **г. Минск, ул. Лили Карастояновой, 32-19**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Помещение санитарно-бытового назначения** | 1,7 кв. м | 500/D-7028275 |

**Начальная цена лота № 3 (с НДС 20 %) – 4 440,00 бел. руб. Шаг аукциона – 222,00 бел. руб.**

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, в том числе документ, подтверждающий внесение задатка с отметкой банка, в размере 10 % от начальной цены предмета аукциона, зарегистрированные в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by

В случае регистрации на аукцион одного участника, предмет аукциона может быть продан данному участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **5 (пять) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона:** предмет аукциона должен быть оплачен покупателем в течение **10 (десяти) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение аукциона, а также оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере 4 (четырех) процентов от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения аукциона

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 02.05.2020

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения аукциона** | **02.10.2020 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата и время окончания приема документов** | **30.09.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@ipmconsult.by**

Фестывалім!

# ГОМЕЛЬ І КРАСНАДАР ПАСЯБРАВАЛІ ПРАЗ СЛОВА

## На Гомельшчыне з'явіцца помнік фізікам і лірыкам

**Паўднёва-ўсходні рэгіён Беларусі стаў месцам прыцягнення перадавой пісьменніцкай супольнасці. Тут прайшоў XV міжнародны фестываль «Славянскія літаратурныя Дажынкі», а таксама чацвёрты міжнародны форум маладых літаратараў і аматараў мастацкай творчасці «Слова».**



На працягу трох дзён больш за 200 прафесійных пісьменнікаў і пачынаючых паэтаў, празаікаў, драматургаў сталі ўдзельнікамі насычанай фестывальнай праграмы. У межах падрыхтоўкі да сёлетніх «Літаратурных Дажынак» на Гомельшчыне прайшоў конкурс мастацкіх твораў, на які было даслана больш як 2300 работ. Падчас літаратурных майстар-класаў, якія сталі часткай праграмы «Славянскіх літаратурных Дажынак», для фіналістаў форуму правялі падрабязны разбор твораў.

Дарэчы, удзельнікамі маштабнага свята мастацкай творчасці, акрамя айчынных майстроў слова, сталі пісьменнікі з Расіі і Украіны. Прычым, напрыклад, расійскія калегі і партнёры прыехалі не толькі расказаць аб сваіх творчых дасягненнях і падзяліцца напрацоўкамі, але і падпісаць новыя дамовы аб супрацоўніцтве.

— За апошнія гады мы рэалізавалі мноства сумесных праектаў, — адзначыла **старшыня Краснадарскага аддзялення саюза пісьменнікаў Расіі Святлана МАКАРАВА-ГРЫЦЭНКА.** — Самае галоўнае, што расце цікавасць да беларускай літаратуры і ў нашай старонцы. Трэба адзначыць, што сумесна выдадзеныя зборнікі беларускіх і краснадарскіх пісьменнікаў знайшлі чытача як у Гомельскай вобласці, так і ў Краснадарскім краі.

У Гомельскім дзяржаўным універсітэце імя Францыска Скарыны прайшла творчая сустрэча пісьменнікаў Беларусі, Расіі і Украіны з выкладчыкамі і студэнтамі. Госці расказалі аб уласнай творчасці, літаратурным жыцці ў сваіх рэгіёнах. Падчас сустрэчы паступіла і цікавая прапанова: увекавечыць у Гомелі памяць знакамітага беларускага пісьменніка Янкі Маўра і яго сына Фёдара Фёдарава — заснавальніка школы беларускай фізікі. Своеасаблівы агульны помнік фізікам і лірыкам, настаўніцкаму слову і навуцы.

Святочныя пляцоўкі «Славянскіх літаратурных Дажынак» разгарнуліся як у абласным цэнтры, так і на тэрыторыі Гомельскай вобласці. Асаблівую ўвагу ўдзельнікаў свята звярнулі на сябе шматлікія творчыя сустрэчы, выставы, аўтограф-сесіі і майстар-класы. На фестывальных пляцоўках ганаровыя госці правялі таксама прэзентацыі сваіх новых кніг.

Арганізатарам свята паранейшаму выступіла Гомельскае абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі. Варта адзначыць, што за 15 гадоў існавання арганізацыі, з-пад пяра пісьменнікаў-жыхароў Гомельшчыны выйшла звыш 550 кніг. Прычым шмат якія творы былі не толькі прызнаныя грамадскасцю, але і атрымалі высокую ацэнку як у Беларусі, так і за яе межамі. За час існавання абласное аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі арганізавала і правяло 95 літаратурных конкурсаў.

— Пісьменнік найперш павінен быць прафесяналам, а гэта няпроста, талент — гэта сур'ёзная праца. Без таленту і напружанай працы над словам не адбудзецца ніякая кніга, яна не закране сэрца чытача і, па сутнасці, застанецца па-за літаратурай, — падкрэсліў **старшыня Гомельскага абласнога аддзялення саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ.** — Безумоўна, задача пісьменніка заключаецца, перш за ўсё, у стварэнні высокамастацкіх твораў, і ў гэтым плане нашаму аддзяленню ёсць чым і кім ганарыцца.

Ад імя кіраўніцтва Гомельшчыны ўдзельнікаў 15-га міжнароднага фестывалю «Славянскія літаратурныя Дажынкі» і 4-га міжнароднага форуму маладых літаратараў «Слова» вітаў **намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ПРЫВАЛАЎ.** Ён падзякаваў літаратарам за адданасць творчай справе.

— Гомельская зямля заўсёды славілася талентамі. Пісьменніцкая сям'я пастаянна знаходзіцца ў пошуках свайго, асаблівага, робіць унёсак у захаванне мясцовых традыцый і роднай мовы. Упэўнены, што межы і жанры конкурсаў і фестываляў у далейшым будуць толькі пашырацца, — адзначыў Уладзімір Прывалаў.

У якасці ацэнкі вынікаў літаратараў за адбылося ўзнагароджанне пісьменнікаў і паэтаў, удзельнікаў «Славянскіх літаратурных Дажынак», памятнымі медалямі імя Манефы Гомельскай ад Гомельскай епархіі і імя Кірылы Тураўскага ад Саюза пісьменнікаў Беларусі. Акрамя таго, шэсць літаратараў сталі лаўрэатамі літаратурнай прэміі імя Кірылы Тураўскага.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

Дажынкі-2020

# «Ураджайнае» графіці

## Скідзель рыхтуецца прыняць абласныя Дажынкі-2020

**Да фестываля аграрыяў горад-спадарожнік Гродна набудзе новы воблік. Зараз вядуцца работы па рамонце адміністрацыйных і жылых будынкаў. Рамантуюцца гарадскія дарогі і магістраль М6. На фасадах жылых дамоў з'явіліся маляўнічыя графіці.**




www.grodnonews.by.

Трэба сказаць, што работы па падрыхтоўцы да Дажынак вядуцца даволі маштабныя. Чакаецца абнаўленне не толькі цэнтральных вуліц, але і ўсяго горада. Праводзіцца капітальны рамонт, добраўпарадкуюцца пешаходныя дарожкі. Па-новаму будзе выглядаць сквер у цэнтры горада. Тут устанаўліваюць ратонду, а пад яе купалам з'явяцца выявы ўсіх гербаў Гродзенскай вобласці.

Капітальна адновяць Дом культуры. У ім пройдзе галоўная фестывальная ўрачыстасць — ушанаванне перадавікоў сельскай гаспадаркі. На мадэрнізацыю будынка плануецца выдаткаваць тры мільёны рублёў. Тут з'явіцца новы кінатэатр, частка гмаху адводзіцца пад загс.

Як паведамілі ў Гродзенскім райвыканкаме, усе работы па падрыхтоўцы да абласных Дажынак вядуцца згодна з планам. Большая частка рамонтных работ завершана, актыўна вядзецца будаўніцтва жылых дамоў. Сёлета будзе здадзены 56-кватэрны жылы дом і 17 блочных двухкватэрных катэджаў. Многія жылыя дамы адрамантаваныя, а на іх тарцах з'явіліся маляўнічыя графіці. На адным з іх — выява маладой пары ў поле на фоне камбайна, на другім дзяўчына збірае снапы, а над ёй ляцяць бусел. Ураджайнай восені радуецца бабуля, якая выглядае з акна. Гэтыя і іншыя выявы ўжо ўпрыгожваюць фасады шматпавярховых дамоў. Усяго такіх малюнкаў будзе адзінаццаць, большасць ужо зроблена.

Не забыліся і пра азеляненне. Высаджана больш як 300 дрэў, 55 тысяч кветак, адрамантавана 10 тысяч квадратных метраў газонаў. Усе работы плануецца завяршыць да 1 лістапада.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# З ХЛЕБАМ І ПЕСНЯЙ

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

Сапраўды, на добраўпарадкаванне вёскі, паляпшэнне сацыяльна-культурных аб'ектаў з розных крыніц было выдаткавана больш за 12 мільёнаў рублёў. Мадэрнізаваныя ўчастковая бальніца і сярэдняя школа, адрамантаваныя яслі-садок і Дом культуры. Сучасны выгляд набылі дарогі, вуліцы, парк. Пабудаваны і рэканструяваны інжынерныя сеткі, сталі больш прывабныя двары. Адным словам, Дзівін сустрэў абласны фестываль працаўнікоў вёскі ва ўсім харастве. Па традыцыі ўрачыстая частка Дажынак пачалася з шэсця перадавікоў. На гэты раз лепшымі камбайнерамі прызнаныя Пётр Мартынюк з сельгаспрадпрыемства «Айчына» Пружанскага раёна, Андрэй Дзянішчык з «Жарабковічаў» Ляхавіцкага раёна, Аляксандр Кіндрук з Сяргеем Ільючыкам з «Дварэцкага» Лунінецкага раёна. Апошнія, дарэчы, трэці год запар становяцца пераможцамі абласнога спаборніцтва.

— Вобласць чарговы раз пацвердзіла статус развітога аграрнага рэгіёна, сабрана больш за мільён тон збожжа, — адзначыў **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС.** — Складнікаў важкага ўраджаю шмат. Былі захаваны аптымальныя тэрміны сяўбы. Больш чым у два разы павялічылі плошчы гібрыднага жыта як прадукцыйнай культуры. Гэтым разам амаль у шэсць разоў пашырылі плошчу грачыхі, што дазволіць забяспечыць насельніцтва грэчкай уласнай вытворчасці. Вельмі важна, што земляробы забяспечылі тэхналагічны догляд пасеваў. Падрыхтавалі тэхніку і збожжасушыльную гаспадарку: ва ўборцы было задзейнічана 1400 камбайнаў, больш за дзве тысячы грузавых аўтамабіляў, 410 збожжасушыльных комплексаў. Хоць сёлета жніво пачалі на паўтара тыдня пазней, ураджай сабралі хутка і якасна.

Такім чынам агульны валавы збор зерня склаў амаль мільён 350 тысяч тон, што на 12 працэнтаў больш, чым летась. З кожнага гектара сабралі 39,6 цэнтнера збожжа, што на чатыры цэнтнеры больш за леташні паказчык, заўважыў губернатар.

Як заўсёды, цэнтральнай падзеяй фестывалю стала ўшанаванне пераможцаў абласнога спаборніцтва па ўборцы ўраджаю. Лепшымі ў гэтым годзе прызнаныя Іванаўскі, Пружанскі, Камянецкі раёны. Сярод сельгасарганізацый першае месца — у гаспадарак «Ляхавіцкае-Агра» Іванаўскага раёна і «Радастаўскае» Драгічынскага раёна.

...Між тым фестываль працягваўся. Шмат у гэты дзень было ўзнагарод, а яшчэ больш — шчырых цікавых усмешак, сустрэч. На розных пляцоўках ішлі канцэрты. Людзі гулялі па вуліцах з сем'ямі, частаваліся, рабілі пакупкі. На фестывалі адначылася і маларыцкая легенда ткацтва Сцепаніда Сцепанюк. 84-гадовая майстрыха не ўседзела дома — прыехала ў Дзівін і паказвала людзям, як на кроснах тчэцца палатно з узорамі. «Люблю святы, люблю людзей, вось і еду» — сказала народны майстар з Дарапеевіч.

Пагуляў 550-гадовы Дзівін, пасвяткаваў. Застануцца ўражанні і здымкі на памяць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ГРОШЫ — НА РАЗВІЦЦЁ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)*

— Гомель — горад, сэрцабіццё якога складаецца з біцця сэрцаў кожнага з нас, — звярнуўся да гараджан і гасцей абласнога цэнтра старшыня аблвыканкама. — Мы разам ствараем атмасферу нашага горада: камфортнага і ўтульнага для жыцця.

Губернатар звярнуў увагу на тое, чаго ўдалося дасягнуць Гомелю за апошні час:

— За апошнія год—два адкрылася шмат сацыяльных аб'ектаў: тры дзіцячыя садкі ў Навабеліцкім раёне, басейн, шматфункцыянальны спартыўны комплекс, лыжаролерная траса, крыты футбольны манеж, паліклініка з комплексам цэнтраў калектыўнага карыстання для жыхароў Гомеля і Гомельскага раёна, школа ў новым мікрараёне, куды першага верасня пайшлі больш за тысячу дзяцей. І ўсё гэта робіце вы сваім талентам, сваімі рукамі, — падкрэсліў Генадзь Салавей.

У падарунак да Дня горада губернатар уручыў грашовыя сертыфікаты — па адным мільёне рублёў кожны. Гэтыя сродкі выдаткуюць на будаўніцтва сярэдняй школы ў 96-м мікрараёне Гомеля, будаўніцтва чатырох спартыўных пляцовак (па адной у кожным раёне горада), рэканструкцыю прыёмнага аддзялення бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі.

— Гэта свята аб'ядноўвае ўсіх тых, хто жыве і калісьці жыў у Гомелі і захоўвае яго часцінку ў сваім сэрцы, знаходзячыся нават за сотні кіламетраў ад нашага горада. Мы дыхаем гісторыяй Гомеля, яго спадчынай і традыцыямі. Да свайго дня нараджэння горад стаў яшчэ больш прыгожым, — звярнуўся да гамяльчан старшыня Гомельскага гарвыканкама Пётр Кірычэнка. — Наша задача зараз — перадаць гэта ўсё наступным пакаленням, адстаяць незалежнасць, захаваць Беларусь як астравок бяспекі і стабільнасці ў цэнтры Еўропы.

Між тым падчас святочнага канцэрта былі названыя прадпрыемствы і арганізацыі, якія будуць занесены на гарадскую Дошку гонару па выніках працы за 2019 год.

Уздоўж адной з цэнтральных вуліц Гомеля — у скверы імя Грамыкі — разгарнуўся традыцыйны горад майстроў. Яго гасцей чакалі пляцоўка «Горад інклюзіі» і фестываль «Вінаград Гомельшчыны», удзел у якім прымалі не толькі мясцовыя вінаградары, але і прадстаўнікі гэтай галіны з усёй Беларусі. Адкрыліся і шматлікія інтэрактыўныя пляцоўкі.

На плошчы Леніна атмасферу маладзёжнага фэсту стваралі ўдзельнікі выставы-кірмашу «Моладзь у прафесіі».

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Шляхі

# СЛЕД У ГІСТОРЫІ

**У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адкрылася літаратурна-дакументальная экспазіцыя «Кастравіцкія», прысвечаная 140-годдзю з дня нараджэння вядомага паэта Гіёма АПАЛІНЭРА.**

У беларускіх архівах захоўваецца вялікая колькасць дакументаў, якія датычацца славутых беларускіх родаў. Яшчэ не аднаму пакаленню даследчыкаў хопіць работы, каб сачыць за лёсам той ці іншай сям'і, за іх набыткамі, традыцыямі, расказваць пра іх унёсак у беларускую культуру. Толькі ў XIX стагоддзі род Кастравіцкіх даў дзве знакавыя асобы, творчасць якіх паўплывала на далейшае развіццё беларускай і еўрапейскай літаратуры і наогул культуры.

Гіём Апалінэр нарадзіўся ў Рыме, яго дзед служыў афіцэрам у расійскім войску, пасля ўдзелу ў паўстанні 1863 года мусіў падацца ў эміграцыю, а радавы маёнтак Кастравіцкіх Дарожкавічы пад Навагрудкам быў канфіскаваны. Гіём працаваў у Парыжы. Паэт, мастацтвазнавец, графік, удзельнік суполкі «Манпарнас» (разам з Пабла Пікаса, Андрэ Брэтонам, Андрэ Дэрэнам, П'ерам Рэвердзі, Жанам Както, Маркам Шагалам, Анры Русо), ён стаў адзін з самых вядомых эксперыментатараў у літаратуры XX стагоддзя, прыдумаў тэрмін «сюррэалізм».



Нататнік з аўтографамі паўстанцаў 1863 года.

У гэты ж час другі прадстаўнік роду Кастравіцкіх, Казімір-Рафал, больш вядомы нам як Карусь Каганец, выступаў за нацыянальнае Адраджэнне ў Беларусі і таксама спрабаваў сябе ў розных кірунках: паэзіі, драматургіі, мовазнаўстве, мастацтве, скульптуры...

Выстаўку рыхтавалі некалькі ўстаноў: акрамя прадметаў з фонду Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, прадстаўлены матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва, Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, Нацыянальнай бібліятэкі, а таксама з прыватных калекцый. Нашчадкі Каруся Каганца, якія сёння пражываюць у Вялікабрытаніі, перадалі фатаграфіі з асабістых архіваў. Яны актыўна займаюцца вывучэннем гісторыі сваіх знакамітых продкаў, выдаюць кнігі, што расказваюць пра гісторыю сям'і. Так, нашчадак роду па матчынай лініі Джэрэмі Мачарскі ўклаў кнігу «Паэзія ў крыві» з твораў не толькі Гіёма Апалінэра і Каруся Каганца, але і іншых прадстаўнікоў роду, якія таксама пісалі вершы.

На выстаўцы можна азнаёміцца з радаводам, даведацца, дзе знаходзіліся сядзібы Кастравіцкіх і па якіх краінах вандравалі прадстаўнікі шляхетнага роду. Вы зазірняце ў «французскую кавярню» і пабачыце карціны, прысвечаныя Гіёму Апалінэру, альбо сурвэткі, на якіх раней мастакі пакідалі аўтографы і малюнкі. Нацыянальная бібліятэка Беларусі спецыяльна для выстаўкі выдзеліла са сваіх фондаў зборнікі твораў знакамітага сюррэаліста, якія пабачылі свет яшчэ пры жыцці аўтара.

Другая частка выстаўкі пераносіць нас у Беларусь, якой яна была 100 гадоў таму. Тут можна ўбачыць нумары «Нашай нівы», кнігі, фальклорныя запісы, над якімі шчыраваў Карусь Каганец, а таксама прыватныя лісты, аздобленыя малюнкамі, якія ён дасылаў з турмы сваёй жонцы і дзецям.

Прадстаўлена і вельмі каштоўная рэліквія, якая захоўвалася ў сям'і Кастравіцкіх, — запісная кніжка з аўтографамі ўдзельнікаў паўстання 1863 года.

Наогул, матэрыялаў, звязаных з родам Кастравіцкіх, магло б хапіць на асобны электронны рэсурс. І гэта выстаўка паказала, што сумеснымі намаганнямі можна ствараць шыкоўныя праекты, звязаныя з захаваннем і папулярызацыяй беларускай літаратурнай і дакументальнай спадчыны. Невыпадкова на яе адкрыцці дырэктар Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры Міхаіл Рыбакоў і дырэктар Нацыянальнага гістарычнага архіва Дзмітрый Яцэвіч падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве. Да таго ж архівісты перадалі сваім калегам-музейшчыкам дакументы, якія раней ніколі не былі ўключаны ў адну архіўную справу, — гэта вынікі працы, якая датычыцца генеалогіі рода Максіма Багдановіча.

# СМАК СПАДЧЫНЫ,
## або Няскончаная місія краязнаўцаў
### Давайце здзяйсняць яе разам

**Сямнаццаць гадоў «Краязнаўчая газета» расказвае пра здабыткі нашага народа, даказвае, што мы можам ганарыцца гісторыяй і культурай краіны. Нагадвае забытыя імёны, адкрывае сакрэты продкаў, ратуе аб'екты спадчыны. Дае падказкі краязнаўцам, выхоўвае дзяцей, збірае каштоўную інфармацыю. Калі пагартаць яе падшыўкі (а на сёння пабачылі свет ужо больш за восемсот нумароў), можна ўбачыць наколькі разнастайны і непаўторны свет дастаўся беларусам у спадчыну...**

**Наша размова з галоўным рэдактарам «Краязнаўчай газеты» Уладзімірам ГІЛЕПАМ.**

***— Не маючы значнага тыражу, фінансавага падсілкоўвання і вялікага штату пастаянных аўтараў, «Краязнаўчая газета» штотыднёва выходзіць ужо столькі гадоў, больш за тое, даказвае, што і без грошай можна зрабіць багата добрых спраў. Якімі дасягненнямі могуць пахваліцца супрацоўнікі газеты?***

— Разам з партнёрамі з Нацыянальнага гістарычнага музея нам удалося правесці краязнаўчы форум. У сваіх выступленнях яго ўдзельнікі часта згадвалі газету і адзначалі, што выданне дапамагае ім на месцы, дзякуючы яму яны дзеляцца вопытам, сочаць за дасягненнямі калег, параймаюць ідэі. Перад тым як мы запусцілі газету, быў закладзены сур'ёзны падмурак. Як мне падаецца, наша краіна была ў краязнаўстве перадавою. Мы першыя з краін былога Савецкага Саюза пачалі выдаваць збор помнікаў гісторыі і культуры (1980-я гады). Гісторыка-дакументальныя хронікі «Памяць» таксама напачатку ажыццёўлены ў Беларусі, і гэта пры тым, што ЦК КПСС нам фактычна забараніў пачынаць гэту справу. Я быў сведкам, як пасля даклада пра тое, што Беларусь гатова выдаваць «кнігі памяці», сакратар ЦК КПСС Міхаіл Зімянін адразу запытаў, ці былі такія выданні ў Расійскай Федэрацыі і Украіне, і сказаў, што не трэба быць «наперадзе ўсіх рэспублік». Але мы ўсё роўна вырашылі выдаваць кнігі, ідэю падтрымаў Машэраў, былі створаны групы па ўсіх раёнах, да справы далучыліся настаўнікі, музейныя работнікі, краязнаўцы. Наогул дзякуючы Пятру Міронавічу Машэраву ўдалося шмат змяніць. Ён узяў у ЦК партыі без усякіх партыйных адукацый чалавека з музея — усё для таго, каб стварыць у краіне больш цікавых непаўторных устаноў, якія можна паказваць усяму свету. Дзвюма пастановамі ЦК было адразу адкрыта 18 раённых музеяў! Яны тады называліся музеямі народнай славы, а пазней ператварыліся ў краязнаўчыя, этнаграфічныя. Можна нават адсачыць, як павялічваўся інтарэс да краязнаўства. Невыпадкова ў Беларускім фондзе культуры пры Іване Гаўрылавічу Чыгрынаве першымі ствараліся аддзелы: роднай мовы, з якога потым вырасла Таварыства беларускай мовы, народных майстроў, фальклору (з якіх таксама ўзніклі таварыствы). Фонд культуры выйшаў і на краязнаўства. Мы адсочвалі, як у пачатку стагоддзя пачала пашырацца цікавасць людзей да свайго нацыянальнага. Беларускі фонд культуры аб'яднаваў людзей, які знаходзілі выдатныя ідэі, запускалі добрыя праграмы. Так пры Іване Гаўрылавічу была распачата праграма па вяртанні каштоўнасцяў, якую ўзначальваў Адам Мальдзіс. Праграма «Славутыя імёны Бацькаўшчыны» падштурхнула Беларускі фонд культуры пачаць выдавецкую справу. У кнігах і на старонках газеты мы расказвалі пра асоб, пра якіх у пачатку новага стагоддзя мала хто ведаў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***— Напэўна, трэба сказаць і пра той унёсак, які робяць краязнаўцы. Як можна працаваць з ведамі, здабытымі імі?***

— Можна прыгадаць апошнія гады мінулага стагоддзя, калі на глебе краязнаўства пачаўся моцны рух у школах. Да пачатку 2000-х у навучальных установах працавала чатыры з паловай тысячы краязнаўчых музеяў! Потым пачалося скарачэнне, у тым ліку гэта было звязана і з тым, што закрываліся школы. Але калі сёлета мы рыхтаваліся да краязнаўчага форуму, даведаліся, што сёння захавалася паўтары тысячы школьных музеяў. Былі сярод іх і такія, якія можна параўнаць з дзяржаўнымі. Напрыклад, у Крэве. Там краязнавец-настаўнік разам са сваёй жонкай стварыў музей, не горшы за раённы краязнаўчы. Ён і сёння існуе. І такіх устаноў, створаных намаганнямі энтузіястаў, на Беларусі многа. Краязнаўцы сабралі асноўны матэрыял для кніг «Памяць». Да першай з іх, якая звязана з Шумілінскім раёнам, я сам прыклаў руку. І ведаю, што такая праца была зроблена ў маленечкім Шуміліне менавіта таму, што там былі моцныя краязнаўцы. Я ўжо не кажу пра Барысаў, Слуцк, Маладзечна, дзе многа школ, настаўнікаў — гісторыкаў, географаў. У той час менавіта яны займаліся падобнымі справамі. А ўжо сёння больш шырокае кола людзей цікавіцца краязнаўствам. Выдаецца маса літаратуры, часам невялікімі тыражамі ў 50—99 экзэмпляраў. Усе раённыя бібліятэкі маюць краязнаўчыя аддзелы, дзе канцэнтруецца літаратура, якая звязана менавіта з гісторыяй і культурай пэўнай мясцовасці.

***— Але ці навучыліся мы гэтым карыстацца?***

— Мы атрымалі абсалютна новы ўзровень гісторыкаў, якія працуюць з такой тэматыкай. З'явіліся такія выданні, як «Оршазнаўства», «Паставазнаўства» і іншыя. У некаторых школах, хоць гэта і па-за праграмай, пачалі праводзіць урокі. Ствараюцца новыя экспазіцыі, выходзяць кнігі. Да нас на практыку пачалі прасіцца падлеткі, якія прыносяць у газету краязнаўчыя матэрыялы са сваіх школ.

***— Ці можна сказаць, што краязнаўства — менавіта той інструмент, які дапамагае развіваць любоў да малой радзімы?***

— Не трэба забывацца і пра мову. Мова і краязнаўства шчыльна звязаны. Калі мы пачалі выдаваць «Краязнаўчую газету» па-беларуску, пасыпалася шмат папрокаў: людзі спасылаліся, што не ўмеюць пісаць на роднай мове, прасілі, каб было двухмоўе. Але як краязнаўства можна па-руску перадаць людзям, дзецям, той жа школе? Напрыклад, назвы ўрочышчаў ніяк не перадаць на іншай мове. А як жа беларускі фальклор? Успамінаю, як я быў маленькі, бабуля клала мяне спаць, двума пальчыкамі вадзіла па маёй голай ручцы і спявала: «Красачка, красачка, дзе ты была? У госці хадзіла, маслейка біла...» Гэтыя словы я запомніў на ўсё жыццё. І гэта памяць — і ёсць краязнаўства. Я невыпадкова заняўся сваім радаводам, каб даведацца адкуль мае продкі, прозвішча. І з гонарам магу сказаць, на якой зямлі спакон веку жылі мае прапра-пра-пра — бабуля і дзядуля. У школах абавязкова павінна быць праграма па радзімазнаўстве. Можа, гэта будзе падавацца не як звычайны ўрок, а як творчая размова, каб дзеці адчувалі, што ў пэўны час яны стануць высвятляць самае галоўнае: хто яны ёсць. І тады ім не захочацца нікуды з'язджаць. Яны будуць ведаць, на якіх могілках ляжаць усе іх родзічы, разумець, што спадчына — каштоўнасць.

***— Краязнаўцы дапамагаюць захаваць тое, што знікае. За апошнія дзесяцігоддзі, калі насельніцтва з вёсак перабіралася ў гарады, мы маглі б страціць усе тыя культурныя набыткі, якія ў рэгіёнах назапашваліся стагоддзямі. Чаму гэту работу нельга спыняць?***

— У «Краязнаўчай газеце» маецца праект. Вёскі знікаюць, і працэс гэты будзе працягвацца. Трактары ўдоўж і ўпоперак аруць зямлю, дзе стаялі дамы. А што застаецца? Могілкі, часам можа захавацца дарога, перакрыжаванне, дзе ставілі крыж. Чаму б побач з такім крыжам не паставіць помнік ці стэлку, на якой даць хоць бы пералік прозвішчаў былых жыхароў. Так мы захаваем не толькі прозвішчы і геаграфію іх размеркавання па Беларусі. Па прозвішчах можна даведацца пра гісторыю вёскі, якія заняткі, характары, стасункі былі ў жыхароў. Мы ствараем яшчэ і адгалінаванні для экскурсійных маршрутаў, падтрымліваем сувязь сённяшніх пакаленняў з папярэднімі. Чалавек, які прачытае сваё прозвішча, захоча памаліцца каля крыжа, пайсці і на могілкі, знайсці, дзе пахаваны ягоныя прадзеды, больш даведацца пра свой род. Гэта будзе новы этап у развіцці краязнаўства. І ў гэтым працяг жыцця мясцін.

***— Не трэба забывацца, што такія веды — гэта падмурак дзяржаўнасці. Сёння гісторыкі працуюць над падручнікамі і курсамі па гісторыі дзяржаўнасці. Але мала абмяжоўвацца толькі гістарычнымі фактамі, трэба расказваць моладзі і пра духоўны свет і здабыткі ва ўсіх галінах культуры. Ці працуе «Краязнаўчая газета» і ў гэтым кірунку?***

— На вялікі жаль, вельмі многа знішчаецца. Людзі не разумеюць каштоўнасці таго, што ім засталося ад бацькоў ці дзядоў. Гэта і мэбля, і дакументальныя сведчанні. Так, я ездзіў глядзець дом, які купіў мой пляменнік. Дом пусты, а печка нечым забітая. Там былі фотаздымкі — чорна-белыя, гістарычныя, даваенныя і пазнейшыя. Крыкам крычаць хочацца: «Людзі, што вы робіце! Гэта ж вашы продкі!» Знішчаюцца і дзённікі, а пачытаў бы ўнук, што пісаў дзед, і ўявіў бы і час, і пачуцці. Чаму б не папрасіць дзяцей прынесці ў школу партрэты сваіх прадзедаў? Няхай параўноўваюць сябе з імі, разважаюць, як раней жылі людзі, у што былі апрануты. Мы павінны звярнуцца да школы. І радзімазнаўства будзе не толькі ўрокам, а цэлай праграмай, дзе абуджаюцца эмоцыі, патрыятычныя пачуцці.

**Матэрыялы падрыхтавала Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# БЫТ АБО НЕ БЫТ



**З аднаго боку, сучасны рытм жыцця не пакідае часу на дробныя бытавыя праблемы. З іншага — бытавая тэхніка сёння даступная кожнаму, і патрэба, напрыклад, у пральнях у сучаснага чалавека практычна адпала. Ці гэта не так? Паспрабуем разабрацца.**

## КЛІНІНГАВЫЯ ПАСЛУГІ

Гэта адзін з найбольш запатрабаваных напрамкаў сферы бытавых паслуг. І справа не ў тым, што цяперашняе пакаленне жанчын — «беларучкі». Проста, як аднойчы трапна заўважыла мая прыяцелька, «жанчыне, якая працуе, самой патрэбна жонка».

***Аргументы «за»:***

• Аптымізацыя часавых выдаткаў

Марнаваць свой выхадны на ўборку кватэры — такі сабе адпачынак. Клінінгавая кампанія возьмецца за вырашэнне пытання, а вы зможаце прысвяціць час таму, чым займацца прыемна, а не «абавязкова». Для сучаснай жанчыны гэта вельмі каштоўна.

• Захаванасць інтэр'еру

У клінінгавых кампаніях працуюць, як правіла, прафесіяналы, і ўсе сродкі для чысткі дываноў, абіўкі мэблі, паліраваных паверхняў, кухоннай пліты і г. д. яны падбіраюць правільна. Гэтых сродкаў, дарэчы, яны прывозяць з сабой цэлы арсенал — для кожнай паверхні свой, што гарантуе захаванасць інтэр'еру. Многія гаспадыні, робячы ўборку самастойна, узброіваюцца адным мыйным сродкам і прынцыпам «адмыем тым, што ёсць».

• Глыбокае ачышчэнне

Ці часта ў вас ёсць сілы на генеральную ўборку? Пагадзіцеся, значна часцей мы проста праціраем пыл, кладзём на месца рэчы і злёгку чысцім пыласосам. Клінінгавая кампанія зробіць ваш дом сапраўды чыстым, і такім ён застанецца яшчэ некалькі тыдняў — бо на тое, каб навесці звыклы «бардак», спатрэбіцца час.

***Аргументы «супраць»:***

• Матэрыяльныя выдаткі

Клінінг — задавальненне нятаннае. Кошт уборкі залежыць ад яе тыпу (калі вы выклікаеце спецыялістаў, каб прыбраць у вашым доме пасля рамонту, накладных выдаткаў спатрэбіцца больш, чым на звычайную ўборку жылога памяшкання) і ад плошчы вашага жылля. Але ёсць і добрыя навіны: паколькі клінінгавых кампаній цяпер шмат і канкурэнцыя вялікая, можна знайсці і досыць бюджэтныя варыянты, і разнастайныя акцыі ды зніжкі.

• Псіхалагічны дыскамфорт

Далёка не кожнаму па душы, калі ў яго доме распараджаюцца чужыя людзі, перастаўляюць яго асабістыя рэчы. Але гэта — непазбежная асаблівасць клінінгавых паслуг, з якой варта змірыцца.

***Каму гэта падыходзіць:***

Жанчынам, якія шмат працуюць. Клінінгавыя кампаніі даюць ім або дадатковы час на працу, або заслужаны час на адпачынак.

Цяжарным жанчынам, асабліва на вялікім тэрміне. Чысціня для будучых мам вельмі важная, але падтрымліваць яе ім ужо цяжка. Дарэчы, скарыстацца паслугамі клінінгавай кампаніі варта і калі жанчына ў радзільні — малога трэба прывозіць у чыстае жыллё, а далёка не кожны тата зможа зрабіць генеральную ўборку.

Мнагадзетным мамам і проста мамам з маленькімі дзецьмі. Спецыялісты здолеюць вырашыць праблему плям на дыване і мэблі, раставтанага пластыліну і запэцканых далонямі аконнага шкла і люстэрка. А мама пакуль проста перавядзе дух.

## ХІМЧЫСТКА

Хімчыстка дываноў і мяккай мэблі, салона аўтамабіля і верхняга адзення — усё гэта запатрабаваныя на сённяшні дзень бытавыя паслугі. Спынімся на самым невідавочным кірунку: ці ёсць сэнс у хімчыстцы адзення (проста адзення, а не цяжкага зімовага паліто), калі можна скарыстацца пральнай машынай, нікуды не хадзіць і пры гэтым сэканоміць бюджэт?

***Аргументы «за»:***

• Захаванасць адзення

Каб любімыя рэчы служылі доўга, трэба чытаць бірку (тую, якую мы прывыклі абразаць). На гэтай бірцы з дапамогай умоўных значкоў паказана, як мыць або чысціць рэч. Але ці многія з нас дазваляюць сабе задавальненне расшыфраваць гэты «клінапіс»? Ці наогул звяртаюць увагу на бірку, засоўваючы світар або майку ў «сціралку»? І нават калі вы выбралі правільны рэжым мыцця, ці здолееце вы правільна высушыць выраб, каб ён не страціў форму?

• Здольнасць спраўляцца з моцнымі забруджваннямі

Уявіце: вы, жанчына, ехалі з важнага мерапрыемства (гэта значыць былі «пры парадзе»), і на трасе ў вас... ну, дапусцім, паўстала неабходнасць памяняць кола на «запаску». А мужчына-памочнік чамусьці не ўзнік з ніадкуль — ні адна машына не спынілася. І пры гэтым ідзе дождж... У выніку дарагі пінжак або спадніцу застаецца толькі выкінуць. Або вы праліл чырвонае віно на святочную сукенку. Засыпаць пляму соллю і хуценька замыць? Лепш звярнуцца з падобнымі праблемамі ў хімчыстку. Сучасныя прафесійныя сродкі дазваляюць выратаваць вопратку, пазбавіўшы яе ад моцных забруджванняў.

• Магчымасць спраўляцца з застарэлымі плямамі

3. В день проведения торгов перед их началом участники обязаны зарегистрироваться у организатора торгов и получить аукционные (конкурсные) номера в месте проведения аукциона.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за предмет аукциона.

Участнику, не выигравшему торги, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Победителю торгов задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах по приобретению предмета торгов.

Торги по конкретному предмету торгов признаются несостоявшимися в случае, если:

- заявление подано только одним участником либо не было подано ни одного заявления;
- на торги явился один из участников либо ни один из участников не явился.

В случае если торги, проводимые в форме аукциона, признаны несостоявшимися, предмет аукциона продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить Организатору торгов установленное вознаграждение согласно заключенному соглашению в течение 5 дней со дня их проведения. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол по результатам торгов. Между продавцом и победителем торгов в течение 15 дней со дня проведения торгов заключается договор купли-продажи.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи, но не позднее 30 дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен (будет в последующем установлен) собранием (комитетом) кредиторов.

Сведения о предыдущих торгах:

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 87 (29201) за 07.05.2020

РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 29 (29143) за 13.02.2020

---

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронных торгов:**

Дорожно-эксплуатационное коммунальное унитарное предприятие «Ремавтодор Октябрьского района г. Минска», 220099, г. Минск, ул. Казинца, 7А, комната 1, +375 17 355 75 14, приемная.

**Оператор электронной торговой площадки:** ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Торги проводятся 09.10.2020** на электронной торговой площадке «БУТБ-Имущество», **www.et.butb.by.**

**Время торгов** устанавливается инструментарием площадки в автоматическом режиме

| № лота | Наименование предмета торгов; его местонахождение | Краткая характеристика | Начальная цена лота, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Бывший в эксплуатации легковой автомобиль «Мицубиси Аутлэндер»; г. Минск, ул. Казинца, 7а** | Бывший в эксплуатации легковой автомобиль «Мицубиси Аутлэндер», внедорожник-универсал, полная масса 2070 кг, идентификационный номер (VIN) JMBXNCU2W7U000455, год выпуска 2006, цвет серый металлик, укомплектован бензиновым двигателем с рабочим объемом 2,0 $дм^3$ | 6 480,00 | 648,00 |

**Продавец:**

**Государственное предприятие «Ремавтодор Октябрьского района г. Минска», г. Минск, ул. Казинца, 7а, комната 1. Контактный телефон +375 17 355 93 99, юрисконсульт Александра Андреевна**

**Окончание приема заявлений на участие в торгах с прилагаемыми к ним документами** – 05.10.2020, до 15.00.

**Задаток** для участия в торгах перечисляется на текущий (расчетный) банковский счет № BY60AKBB30120000066940000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код AKBBBY2X, УНП 190542056, получатель платежа – ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа». **Срок внесения задатка** – не позднее даты и времени окончания приема заявлений на участие в торгах. **Назначение платежа**: внесение суммы задатка для участия в электронных торгах рег. № ___ по заявлению № ___.

Электронные торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 608 и Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке ОАО «Белорусская универсальная товарная биржа».

**Сроки возмещения затрат на организацию и проведение торгов:**

*Победитель (единственный участник) торгов в течение 5 рабочих дней после утверждения протокола о результатах торгов обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, иные платежи, указанные в протоколе.*

**Сроки и условия заключения договора:**

*Срок подписания договора купли-продажи имущества – не позднее 7 рабочих дней со дня возмещения вышеназванных затрат, иных платежей, указанных в протоколе о результатах торгов.*

УНП 190017438

---

## ОЗЕРСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ

**сообщает о проведении 14 октября 2020 года по адресу: агрогородок Озеро, улица Дзержинская, 27б в 10.00 открытого аукциона по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов**

| Лот № | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Начальная цена, бел. руб. | Расходы по подготовке землеустроительной документации, руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Аукцион по продаже земельных участков гражданам в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | | | | | | |
| 1 | Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Светлая, участок № 6, кадастровый номер 625682504101000065 | 0,1498 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 18 000,00 | 1 521,53 + публикация в газете | 1 800,00 |
| 2 | Минская область, Узденский район, деревня Дубище, улица Светлая, участок № 8, кадастровый номер 625682504101000069 | 0,1499 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 18 000,00 | 1 441,07 + публикация в газете | 1 800,00 |
| 3 | Минская область, Узденский район, деревня Нитиевские, улица Солнечная, участок № 2А, кадастровый номер 625682508101000067 | 0,1500 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 17 500,00 | 1515,06 + публикация в газете | 1 750,00 |
| 4 | Минская область, Узденский район, деревня Сороковщина, улица Цветочная, участок № 17, кадастровый номер 625682510101000148 | 0,1500 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 16 000,00 | 1353,58 + публикация в газете | 1 600,00 |
| 5 | Минская область, Узденский район, деревня Сороковщина, улица Цветочная, участок № 16, кадастровый номер 625682510101000149 | 0,1499 | Возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению. Подъезд с грунтовой дороги | 16 000,00 | 1515,06 + публикация в газете | 1 600,00 |

Задаток (10 % от начальной цены) перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на расчетный счет № BY97AKBB36410625001436000000 в ЦБУ № 625 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, БИК AKBBBY2X, УНП 600110154, код платежа – 4901. Получатель – Озерский сельский исполнительный комитет.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 с 14.00 до 17.00 по адресу: Минская область, Узденский район, аг. Озеро, ул. Дзержинская, 27б. Последний день приема заявлений – **9 октября 2020 года до 17.00.** Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

1) заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

2) заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка;

3) копию документа, содержащего его идентификационные сведения (ксерокопию паспорта);

4) представителям гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

Оплата победителем предмета аукциона производится разовым платежом путем безналичных расчетов.

Победителю за предмет аукциона необходимо произвести возмещение фактических расходов по организации и проведению аукционов и подготовке документации для его проведения.

Участники аукциона предварительно могут ознакомиться с земельными участками, которые предлагаются для продажи на аукционе, путем выезда к месту нахождения этих участков.

Более подробную информацию об аукционах, условиях участия можно получить по телефонам: (801718) 49-3-42, 49-3-47, +375-29-5-65-91-60.

# АДНАЎЛЕННЕ ГІСТАРЫЧНАЙ

## ЯК ГЭТА — БЫЦЬ ПАДЗЕЛЕНЫМІ...

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР восенню 1939 года мае велізарнае значэнне для гісторыі Беларусі, беларускага народа і сучаснай беларускай дзяржавы. Без гэтага не было б сучаснай Рэспублікі Беларусь у такім фармаце, які мы маем. Гэтай падзеяй была адноўленая гістарычная справядлівасць пасля несправядлівага падзелу беларусаў згодна з Рыжскай мірнай дамовай.

**Мікалай СМЯХОВІЧ:** У 1918 годзе польскія палітычныя колы палічылі, што настаў гістарычны момант, які дае магчымасць аднавіць межы Рэчы Паспалітай да яе падзелаў, але не ўлічылі, што з таго часу этнанацыянальнае становішча кардынальным чынам змянілася. Паняцце беларусы, беларускасць, беларушчына, беларуская нацыя для палякаў XVIII стагоддзя было навіной. Яны не пагаджаліся з гэтымі тэрмінамі і лічылі, што тут пражываюць палякі або апалячанае насельніцтва. Ігнаруючы рост беларускай нацыянальнай самасвядомасці, выспяванне беларускай нацыянальнай ідэі, якая рэалізавалася ў форме БНР і БССР, польскія колы, падтрыманыя Антантай, выкарысталі гістарычны момант і ажыццявілі свае стратэгічныя планы па стварэнні новай геапалітычнай рэальнасці пад назвай Другая Рэч Паспалітая.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** З нашага пункту гледжання гэты тэрмін не зусім прымальны, бо Рэч Паспалітая была рэспублікай двух народаў. У разглядаемы ж час кіраўніцтва Польшчы аднаўляла аднaзначна польскую дзяржаву. Таму не зусім карэктна ўжываць тэрмін Другая Рэч Паспалітая.

**Мікалай СМЯХОВІЧ:** Польскі бок падчас вайны захапіў Мінск. Калі вывучаеш дакументы акупацыйнага рэжыму, то разумееш, што так, стварaлі бальніцы, школы, разглядалі мясцовае самакіраванне... Але ні ў адным дакуменце акупацыйных улад Мінска не было наймення «беларусы».

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Даходзіла да таго, што калі чалавек хацеў атрымаць нейкую дапамогу, ён звяртаўся да ўлад і яму казалі: «Запісвайся палякам, атрымаеш». У польскім нацыянальным руху, які выступаў за адраджэнне польскай дзяржавы панавала наступная канцэпцыя — беларусы і украінцы не з'яўляюцца гістарычнымі нацыямі, не маюць права на сваю гісторыю, дзяржаву і падлягаюць асіміляцыі.

**Сяргей ТРАЦЦЯК:** Сітуацыя лістапада—снежня 1918 года і ў савецкім кіраўніцтве, і ў польскім пачала разглядацца як гонка да заняцця рубяжоў і пунктаў на спрэчных тэрыторыях. Тое, што тут ёсць беларусы, літоўцы і ўкраінцы, не прымалася пад увагу. Савецкі бок разглядаў тэрыторыі з пункту гледжання таго, што тут неабходна стварыць буферныя дзяржавы, якія аддзеляць Савецкую Расію ад агрэсійнай Польшчы, на тэрыторыі якіх можна будзе весці вайну і ў выпадку чаго імі можна будзе ахвяраваць.

Менавіта такі інструментальны падыход быў ужыты савецкім

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ.



Мікалай СМЯХОВІЧ.



Сяргей ТРАЦЦЯК.

урадам пры стварэнні і Літоўскай Савецкай Рэспублікі, і ССРБ. Ні Савецкая Расія, ні Польшча вайны адзін аднаму не аб'явілі. Тое, што баявыя дзеянні афіцыйна вяліся на тэрыторыі фармальна незалежных рэспублік савецкай краіны, шмат каму з расійскіх даследчыкаў дагэтуль дае падставу сцвярджаць: вайна з Польшчай для Савецкай Расіі пачалася толькі ў 1920 годзе атакай на Мазыр і Кіеў. Гэта аднак далёка не так.

Падчас баявых дзеянняў у 1919—1920 гадах Юзаф Пілсудскі заяўляў, што вядзецца вайна не толькі за адраджэнне Вялікай Польшчы, вядзецца вайна за стварэнне Усходнееўрапейскай Федэрацыі, у якой Польшча будзе гегемонам. Што датычыцца тэрыторыі Беларусі, то Пілсудскі быў гатовы стварыць марыянетачную Беларускую рэспубліку на тэрыторыі Мінскай губерні.

Урэшце ў 1920 годзе, калі Савецкая Расія паспрабавала не толькі адбіць страчанае, але і прывесці на штыках пралетарскую рэвалюцыю ў Еўропу, беларусы аказаліся паміж двух варожых агнёў. Рыжскі мірны дагавор падпісваўся і распрацоўваўся без удзелу прадстаўнікоў Беларусі. У Рызе былі беларускія дэлегацыі, аднак на кантакт прадстаўнікі Савецкай Беларусі і БНР пайшлі, калі стала відавочна: мір за кошт Беларусі ўжо прадвызначаны і нічога спыніць нельга.

**Мікалай СМЯХОВІЧ:** У 1920—1921 гадах у Расіі склалася крызісная унутрыпалітычная сітуацыя. Перад бальшавіцкім урадам паўстала пытанне: ці ваяваць на два франты (унутры з сялянскім антыбальшавіцкім рухам і на Заходнім фронце), ці ахвяраваць тэрыторыяй Беларусі і Украіны ў імя выратавання ўлады і стабілізацыі палітычнага становішча. Дарэчы, Ленін Рыжскі мірны дагавор назваў пачэсным і справядлівым для Расіі. І ў савецкай гістарыяграфіі імкнуліся ўвесь час не заўважаць гэтага азначэння, бо было зразумела — ён імперыялістычны і несумленны.

## «НІЧОГА ЎЗАМЕН НЕ ДАВАЦЬ»

**Сяргей ТРАЦЦЯК:** У Заходняй Беларусі ў шмат якіх тэндэнцыях працягнулася тое, што заклалі яшчэ да Першай сусветнай вайны. У прыватнасці, тут не было крутой сацыяльна-эканамічнай ломкі інстытутаў. Існавалі сацыяльныя інстытуты, закладзеныя яшчэ да Першай сусветнай вайны, праўда з пэўнай пераафарбоўкай. Іншая справа, што Заходняя Беларусь была ў няроўных умовах з Беларуссю Савецкай. Прытым, што Савецкая Беларусь у 1921 годзе — гэта агрызак Мінскай губерні з шасці паветаў. Але гэта была беларуская дзяржава, вакол якой імкнуліся аб'яднацца беларускія тэрыторыі. У 1924-м, 1926 гадах адбылося першае вялікае ўз'яднанне беларускага народа, гэта дало магчымасць дадаць і эканамічных, і палітычных, і сацыяльна-культурных магчымасцяў для развіцця.

У Заходняй Беларусі ў той момант адсутнічала нават куцая тэрытарыяльная, гаспадарчая, культурная аўтаномія. Польскі ўрад адразу ўзяў курс на апалячванне. Беларускі народ лічылі глінай у моцных руках. Палітыка асіміляцыі праводзілася гвалтоўнымі метадамі. Было так, што сяляне па законе ў 1921 годзе зямлі фактычна не атрымалі.

Парцэляцыя ў Заходняй Беларусі праходзіла за кошт самых сялян. Яны павінны былі аплаціць работу землеўладкавальных камісій, каморнікаў, аплаціць за свой кошт перанос гаспадарчых пабудоў. Побач з парцэляцыяй праводзілася камасацыя — сяленне гаспадарак на хутары. Атрымалася, што ў беларускай вёсцы 2/3 гаспадарак былі карлікавыя, якім не хапала прадукцыі сваёй вытворчасці для спажывання. Людзі вымушаны былі працаваць на кабальных умовах у памешчыцкіх гаспадарках і гаспадарках сялянскіх прадпрымальнікаў.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Такое становішча прыводзіла да абвастрэння сацыяльнага руху, пратэсных выступленняў сялян. Да складанага сацыяльнага становішча дадаваўся яшчэ нацыянальны ўціск. Хоць па Рыжскім мірным дагаворы Польшча ўзяла на сябе абавязак забяспечваць інтарэсы нацыянальных меншасцяў. Увогуле Польшча была шматнацыянальнай дзяржавай — 36 працэнтаў жыхароў складалі непалякі. У першай палове 1920-х гадоў беларускі нацыянальны рух пачаў вельмі актыўна развівацца ў форме ўзброенай барацьбы партызанскіх атрадаў, якія арганізоўвалі эсэры і камуністы пры падтрымцы насельніцтва.

Адначасова ажыццяўлялася адстойванне правоў беларусаў праз парламенцкія выбары, стварэнне Беларускага пасольскага клуба дэпутатаў. Таксама можна нагадаць заснаванне Таварыства беларускай школы, якое займалася забеспячэннем нацыянальнай адукацыі. Нявырашанасць сацыяльных праблем прывяла да таго, што беларускі нацыянальны рух схіляўся ў левы бок. Больш папулярнымі сталі ідэі Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, што дзейнічала ў падполлі. Найбольш яскравым уздымам нацыянальнага руху лічыцца дзейнасць Беларускай сялянска-работніцкай грамады ў 1925—1927 гадах. Але з прыходам да ўлады Юзафа Пілсудскага ў 1926 годзе пачынаецца палітыка «санацыі» — яна мела на мэце ўзмацненне ціску на нацыянальна-вызваленчы рух.

**Мікалай СМЯХОВІЧ:** Звярну ўвагу на звычайнае жыццё. Існаванне беларусаў у складзе Польшчы дало практычныя гістарычныя ўрокі, якія адкладзіся ў іх генетычнай памяці. Мой бацька хадзіў два класы ў польскую школу. Ён расказваў: настаўнікі так здзекаваліся з беларускіх дзяцей, што ён два гады ледзь вытрымаў. У нашага старэйшага пакалення ў свядомасць увайшло прыняцце палякаў як ворагаў у нацыянальных адносінах.

У плане працы магчымасці ўсё ж былі. Але вось нацыянальны прыгнёт, калі праваслаўных і беларусаў не лічылі за людзей, у нашага народа ўкараніўся ў кроў. Таму асноўная маса насельніцтва, незалежна ад сацыяльнага становішча, вітала вызваленчы паход Чырвонай Арміі. Такім чынам, і сацыяльныя, і нацыянальныя фактары ляжалі ў аснове вызваленчага паходу.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Паказальна, што палітыка паланізацыі да 1939 года не была завершана. Гэта гаворыць аб тым, што, з аднаго боку, беларускае насельніцтва мела моцны ўнутраны стрыжань і людзі не паддаваліся. З іншага — калі б не адбыліся падзеі восені 1939 года, думаю, польскія ўлады не адмовіліся б ад яе. Беластоцкі ваявода Асташэўскі ў чэрвені 1939 года пісаў наступнае: «...Мы жадаем аднаго і настойліва патрабуем, каб гэта нацыянальная меншасць (беларусы. — Даніловіч) думала па-польску — нічога ўзамен не даваць і нічога не рабіць у іншым кірунку. Зараз яшчэ можна беларусаў асіміляваць у адзінае рэчышча польскай культуры. Рана ці позна беларускае насельніцтва будзе паланізаванае».

Урэшце з'явілася б шмат праваслаўных палякаў на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Тое, што зараз мы бачым, напрыклад, на Беласточчыне. Праваслаўныя палякі — гэта фактычна ўкраінцы і беларусы, якія захавалі веру, а ўсведамляюць сябе як частку польскага народа, і гэта вынік асіміляцыі.

## «НАША СПРАВА — ВЫНЕСЦІ ЎРОКІ»

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Хачу звярнуць увагу на геапалітычны кантэкст, у якім адбыўся паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь у 1939 годзе. Напачатку 1930-х гадоў у Германіі да ўлады прыходзіць нацысцкая партыя, якая вельмі імкліва пачынае адраджаць эканамічны і ваенны патэнцыял краіны. Гэта адбывалася пры велізарнай падтрымцы звонку, у першую чаргу, фінансавых капіталаў заходніх краін, Злучаных Штатаў Амерыкі, якія былі зацікаўленыя ва ўмацаванні Германіі і бачылі ў ёй сілу, якую можна накіраваць супраць Савецкага Саюза.

Яскравы прыклад такой падтрымкі — Мюнхенскае пагадненне 1938 года. Да гэтага быў праведзены аншлюс Аўстрыі Германіяй. Далей былі прэтэнзіі Гітлера да Чэхаславакіі, дзе пражывала значная колькасць немецкай меншасці. Сама па сабе Чэхаславакія была вельмі моцнай еўрапейскай краінай, з моцнымі ўзброенымі сіламі. Калі б дайшло да вайны, Германіі вельмі цяжка было б захапіць Чэхаславакію, тым больш што ў апошняй была дамова аб дапамозе з СССР.

Дарэчы, Савецкі Саюз праяўляў мірныя ініцыятывы, заклікаў да раззбраення, стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі супраць Германіі і яе саюзнікаў, якія праводзілі агрэсіўную палітыку. Але далей перамоў нічога не зрушвалася. Мюнхенскае пагадненне фактычна засведчыла гатоўнасць з боку заходніх краін да любых саступак для Германіі, каб тая рухалася ва ўсходнім напрамку. У выніку ў 1938 годзе адбыўся падзел Чэхаславакіі, у якім узяла ўдзел і Польшча.

Вяду да таго, што пакт Рыбентропа—Молатава не з'яўляўся нечым неардынарным для тагачаснай палітыкі. Такіх пактаў мелася дастатковая колькасць. СССР быў апошняй еўрапейскай краінай, якая падпісала дагавор аб ненападзенні з нацысцкай Германіяй. Яшчэ ў 1934 годзе гэта зрабіла Польшча, у 1938 годзе — Вялікабрытанія і Францыя, да жніўня 1939 года — усе прыбалтыйскія краіны і Данія. Заключаны пакт быў па ініцыятыве германскага боку, а Савецкі Саюз фактычна быў вымушаны пайсці на гэты крок, таму што з заходнімі дэмакратыямі так і не ўдалося дамовіцца аб стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі, а вайну трэба было нейкім чынам адцягнуць.

**«Дагэтуль няма ў Беларусі помніка найвыдатнейшаму дзеячу беларускага нацыянальнага вызваленчага руху Браніславу Тарашкевічу».**

Сакрэтны пратакол да пакта Рыбентропа—Молатава прадугледжваў, што пад савецкі ўплыў адыходзілі Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна. Савецкі Саюз бачыў сваю місію ў тым, каб аб'яднаць падзеленыя нацыі, і каб абараніць іх, калі адбудуцца ваенныя дзеянні і Польская дзяржава прыйдзе да распаду.

**Сяргей ТРАЦЦЯК:** Кажучы пра геапалітычныя перадумовы ўз'яднання, трэба ўспомніць, што Польшча з 1933 да пачатку 1939 года была вельмі цесным партнёрам нацысцкага рэйху. Пасля таго, як у 1933 годзе Германія пакінула Лігу Нацый, яна ўзяла на сябе клопат аб германскіх інтарэсах. Дагавор аб ненападзенні 1934 года, у адрозненне ад пакта Рыбентропа—Молатава, па сутнасці быў дагаворам аб супрацоўніцтве.

Той жа канцлагер у Барозе-Картузскай быў створаны дэкрэтам прэзідэнта Польшчы ў 1934 годзе

# СПРАВЯДЛІВАСЦІ

на ўзор канцлагераў нацысцкай Германіі. Паміж Польшчай і Германіяй быў наладжаны вельмі актыўны абмен разведвальнай інфармацыяй. Польшча нават разглядалася і савецкім кіраўніцтвам, і кіраўніцтвам англа-французскага блока ў 1934—1938 гадах як найбольш верагодны ваенны праціўнік. Тут трэба заўважыць, што ў Польшчы быў неўрэгуляваны тэрытарыяльны канфлікт з Літвой. Менавіта Літва разглядалася польскім урадам як першы і асноўны праціўнік, і першая краіна, з якой можна будзе зрабіць аншлюс.

**«Адпаведнае свята павінна быць аднесена да дзяржаўных, яго трэба належным чынам адзначаць. Лічу, што найбольш аптымальная дата — 14 лістапада, яе можна назваць «Днём нацыянальнага адзінства».**

Аншлюс Аўстрыі прывёў да таго, што ў самой Польшчы пачаліся заклікі да паходу на Коўна. У выніку Літве выкруцілі рукі і прымусілі яе прызнаць факт захопу Вільні і падпісаць мірнае пагадненне з Польшчай. Таму што і Савецкі Саюз, і Германія ўхіліліся ад падтрымкі Літвы. Не дзіўна, што Польшча прыняла актыўны ўдзел у расчляненні Чэхаславакіі, таму што і тут быў тэрытарыяльны канфлікт з-за Сілезіі.

Для Польшчы званочак прагучаў тады, калі Гітлер пасля канчатковага паглынання Чэхаславакіі выставіў тэрытарыяльныя прэтэнзіі ўжо ёй. Атрымалася тое, пра што Уінстан Чэрчыль у сваіх успамінах зазначаў: мы былі вымушаны гарантаваць бяспеку краіне, якая нагадвала вар'ятаў на парахавым заводзе. Менавіта пазіцыя Польшчы прывяла да зрыву планаў паходу Чырвонай Арміі на дапамогу Чэхаславакіі ў 1938 годзе. Польшча заявіла, што савецкія войскі не прапусціць і нават пачала ваенныя манеўры ва ўсходніх ваяводствах і канцэнтрацыю войскаў на польска-савецкай мяжы. Праз гэта паход Чырвонай Арміі на дапамогу Чэхаславакіі выліўся б у савецка-польскую вайну.

У 1939 годзе менавіта нежаданне Польшчы прапусціць савецкія войскі праз сваю тэрыторыю для баявых дзеянняў з Германіяй прывяло да тарпедавання перагавораў паміж СССР, Вялікабрытаніяй і Францыяй у Маскве аб заключэнні антыгерманскага ваеннага пакта. У прынцыпе, польскі ўрад тут меў рацыю, бо ўступленне савецкіх войскаў на тэрыторыю Польшчы, нават калі яны прыходзяць не як праціўнікі, а як праходзячыя саюзнікі, прывяло б да незапланаваных наступстваў ва ўсходніх ваяводствах.

У верасні 1939 года, калі пачалася Другая сусветная вайна, і калі Польская дзяржава пала нечакана хутка (разлік быў на тое, што польскія войскі пратрымаюцца два-тры месяцы, а абарона на лініі Віслы можа для немцаў стаць моцным арэшкам, але польская армія была разгромленая ў прыгранічных баях за тыдзень, і далей пачалася агонія дзяржавы), савецкае кіраўніцтва вымушана было мяняць на хаду ўсе свае планы адносна еўрапейскага тэатра ваенных дзеянняў. Гэта зрабіла і паход у Заходнюю Беларусь непазбежным.

**Мікалай СМЯХОВІЧ:** Усе намаганні прадузятых гісторыкаў выставіць Савецкі Саюз вінаватым за развязванне Другой сусветнай вайны праз абвінавачванне ў падпісанні пакта Рыбентропа—Молатава пад сабой не маюць ніякай падставы і ніколі не будуць прызнаныя навуковымі.

Па-першае, перад Савецкім Саюзам пасля правалу перагавораў з Англіяй і Францыяй пра стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі паўстала пытанне — што рабіць далей у геапалітычных адносінах? Адмова ад падпісання пакта аб ненападзенні з Германіяй азначала б тое, што Савецкі Саюз рыхтуецца да агрэсіі супраць Германіі. Але ў 1939 годзе ні ў эканамічных, ні ў палітычных, ні ў ваенных адносінах савецкая дзяржава да вайны была непадрыхтаваная. Падпісанне дамовы дазваляла адцягнуць вайну. Падпісанне сакрэтнага пратакола таксама адпавядала інтарэсам савецкай дзяржавы.

Больш за тое, з пункту гледжання беларускай дзяржаўнасці, не мае значэння, якія гістарычныя падзеі прывялі да нацыянальнага ўз'яднання. У 1921 годзе тэрыторыя БССР была падзеленая без удзелу беларусаў, і ў 1939 годзе беларусаў зноў не спыталі. Але, калі мы ацэньваем значнасць гістарычных падзей з пункту гледжання беларускай дзяржаўнасці, то Рыжскі дагавор — нацыянальная трагедыя, а паход Чырвонай Арміі 1939 года — аднаўленне гістарычнай справядлівасці. Для нас важна, якія наступствы для беларусаў мела гэта падзея. Наўрад ці падчас падпісання пагаднення аб ненападзенні савецкаму кіраўніцтву было вядома пра сапраўдныя мэты і далейшыя планы Германіі.

Мы, як гісторыкі, не маем права асуджаць, наша справа — вынесці ўрокі. У гэтым выпадку ўрок наступны: калі адбыўся несправядлівы гістарычны акт у адносінах да якога-небудзь народа, то рана ці позна несправядлівасць будзе ліквідавана. Гэта трэба памятаць і сучасным палітыкам. На трагедыі народа ніхто ніколі не атрымліваў і не атрымае ніякіх дывідэндаў. Толькі мір і згода паміж народамі можа мець станоўчы вынік.

Нядаўна, успамінаючы герояў Вестэрплатэ, польскія палітычныя дзеячы казалі, што тыя змагаліся супраць агрэсіі германскай і супраць агрэсіі савецкай. Гэта — прыклад рэваншызму і непрызнання вынікаў Другой сусветнай вайны. Калі яны на адзін бок ставяць нацысцкую Германію і Савецкі Саюз, абвінавачваючы і першых, і другіх у развязванні Другой сусветнай вайны, то тэрытарыяльныя прэтэнзіі да Беларусі відавочныя.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** На тэрыторыі Заходняй Беларусі, па падліках польскіх гісторыкаў, адбылося толькі каля 40 сутычак паміж Чырвонай Арміяй і польскімі ўзброенымі фарміраваннямі. Калі б большасць насельніцтва выступала супраць Чырвонай Арміі, відавочна, разгарнуўся б і партызанскі рух, але гэтага не адбылося.

Так, далёка не ўсё насельніцтва станоўча ўспрыняло прыход савецкай улады. У першую чаргу, гэта былі заможныя людзі, асаднікі, дзяржслужачыя. У выніку было прынята рашэнне аб перасяленні такіх асоб разам з сем'ямі (усяго каля 120 тысяч чалавек) з Заходняй Беларусі ўглыб Савецкага Саюза. Гэта трагедыя, але крок быў вымушаны.


ДЕКЛАРАЦИЯ
БЕЛОРУССКОГО НАРОДНОГО СОБРАНИЯ ПО ВОПРОСУ О ВХОЖДЕНИИ ЗАПАДНОЙ БЕЛОРУССИИ В СОСТАВ БЕЛОРУССКОЙ СОВЕТСКОЙ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЙ РЕСПУБЛИКИ

[illegible]

ПРИНЯТЬ ЗАПАДНУЮ БЕЛОРУССИЮ В СОСТАВ СОВЕТСКОГО СОЮЗА И БЕЛОРУССКОЙ СОВЕТСКОЙ СОЦИАЛИСТИЧЕСКОЙ РЕСПУБЛИКИ, ВОССОЕДИНИТЬ БЕЛОРУССКИЙ НАРОД В ЕДИНОМ ГОСУДАРСТВЕ И ПОЛОЖИТЬ ТЕМ САМЫМ КОНЕЦ РАЗОБЩЕНИЮ БЕЛОРУССКОГО НАРОДА.

[illegible]

Выніковы дакумент Народнага сходу Заходняй Беларусі.

**Сяргей ТРАЦЦЯК:** Падчас вераснёўскіх падзей 1939 года польскае кіраўніцтва і шараговыя палякі з непрыемным здзіўленнем убачылі, што для пераважнай большасці насельніцтва «крэсаў усходніх» Польшча не з'яўляецца бацькаўшчынай сваёй. Яна для іх чужая бацькаўшчына. Адзін з твораў беларускай літаратуры і кінематаграфіі пра знаходжанне Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы так і называецца — «Чужая бацькаўшчына».

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Сам працэс уз'яднання адбыўся дэмакратычным шляхам. Рашэнне было прынятае на Народным сходзе Заходняй Беларусі, які звярнуўся да савецкай улады з адпаведнай просьбай. Большасць на гэтым сходзе складалі беларусы, але і па факце большасць насельніцтва Заходняй Беларусі была прадстаўленая беларусамі. Гэты працэс завяршыўся 14 лістапада 1939 года, калі Вярхоўны Савет БССР прыняў адпаведны закон.

## ...І ЯК ГЭТА — ВЯРНУЦЬ АДЗІНСТВА

**Сяргей ТРАЦЦЯК:** Для беларусаў падзеі 1921—1941 гадоў — гэта гісторыя таго, як гэта — жыць падзеленаму народу, і як гэта — адчуць, што, нарэшце, і народ адзіны, і беларуская дзяржава адзіная. У беларускіх гарадах, сёлах ёсць вуліцы, якія носяць імёны актыўных удзельнікаў нацыянальна-вызваленчага руху, у першую чаргу камуністаў Заходняй Беларусі. Аднак пытанне мемарыялізацыі тых падзей, якія засведчылі перад беларусамі і ўсім светам, што народ Заходняй Беларусі не скарыўся і змагаецца за свае правы людзьмі звацца — патрабуе большай увагі ад улады і грамадства.

Дагэтуль няма ў Беларусі помніка найвыдатнейшаму дзеячу беларускага нацыянальнага вызваленчага руху Браніславу Тарашкевічу — чалавеку, які ўзначаліў Беларускую сялянска-работніцкую грамаду. І гэта несправядліва.

**«У Заходняй Беларусі ў той момант адсутнічала нават куцая тэрытарыяльная, гаспадарчая, культурная аўтаномія. Польскі ўрад адразу ўзяў курс на апалячванне. Беларускі народ лічылі глінай у моцных руках. Палітыка асіміляцыі праводзілася гвалтоўнымі метадамі».**

Народны сход Заходняй Беларусі 30 кастрычніка 1939 года абвясціў дзень 17 верасня Днём вызвалення працоўных Заходняй Беларусі ад гнёту буржуазіі і памешчыкаў. У такім статусе гэты дзень быў адсвяткаваны ў 1940 годзе, а потым была вайна.

Пасля вайны шмат чаго змянілася. Польская Народная Рэспубліка стала важным ваенным і палітычным саюзнікам Савецкага Саюза, і было прынятае рашэнне не крыўдзіць палякаў, не растраўліваць іх раны, пра што вельмі прасілі і самі польскія кіраўнікі.

Тут трэба заўважыць, што менавіта кіраўніцтва Польскай Народнай Рэспублікі падчас прэзідэнцтва Баляслава Берута давяло палітыку нацыянальнай асіміляцыі да лагічнага канца: у першапачатковым варыянце Канстытуцыі нават адсутнічала згадка пра тое, што ў Польшчы ёсць непалякі. І калі пры Уладзіславу Гамулку высветлілася, што з 30 мільёнаў жыхароў ПНР кожны 30-ы — непаляк, гэта ў Польшчы выклікала адчуванне вылітай на галаву халоднай вады.

Апошні раз на дзяржаўным узроўні ў БССР дзень 17 верасня святкаваўся ў 1949 годзе — у дзясятую гадавіну пачатку паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Пасля — толькі ў заходнім рэгіёне і максімальна ціха. У выніку адбылася стыгматызацыя 17 верасня ў гістарычнай памяці палякаў, густа замешаная на гістарычным рэваншызме, і негатыўная міфалагізацыя гістарычнай памяці беларусаў, у першую чаргу, беларускай інтэлігенцыі. Для апошняй на першы план выйшлі рэпрэсіі 1939—1940 гадоў супраць некамуністычных беларускіх нацыянальна-палітычных сіл.

У 1989 годзе ветэраны Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, сярод якіх трэба адзначыць і народнага паэта Беларусі Максіма Танка, узнялі пытанне аб тым, каб адзначаць гэту падзею на нацыянальным узроўні. Яны прапанавалі ўсталяваць у Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспубліцы агульнадзяржаўнае свята — Дзень уз'яднання Заходняй Беларусі з БССР. Пытанне разглядалася ў Вярхоўным Савеце БССР, і ўрэшце 11 студзеня 1990 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР выдаў указ, які вызначыў Дзень уз'яднання ў якасці святочнага, і абвясціў гэтым днём 14 лістапада — дзень прыняцця на III пазачарговай сесіі Вярхоўнага Савета БССР адпаведнага закона. У 1991-м свята ўжо не адзначалася, бо кардынальна змянілася палітычная сітуацыя, і беларускае кіраўніцтва зноў стала зыходзіць з прынцыпу «не трэба крыўдзіць палякаў».

**Мікалай СМЯХОВІЧ:** У нас сёння няма панацэя Заходняя Беларусь. Нацыя, народ адзіныя, і няма ніякага падзелу на ўсходніх і заходніх беларусаў. Людзі нічым адзін ад аднаго не адрозніваюцца: ні ў этнічных, ні ў любых іншых адносінах. Тым не менш для ўсёй Беларусі, для нашай нацыі і для нашай нацыянальнай ідэі XXI стагоддзя, а яна ў выглядзе закліку, лічу, гучыць так: «Беларусь! Справядлівасць! Адзінства!» — Дзень нацыянальнага адзінства абавязкова павінен быць.

Улічваючы, што ніхто на заканадаўчым узроўні не адмяняў акты, якія былі прынятыя Вярхоўным Саветам БССР у 1990 годзе, нашы заканадаўцы павінны разгледзець гэтае пытанне і паставіць кропку: спыніць дзеянне ўказа або аднавіць. Думаю, прыйшла пара вырашыць гэтае пытанне.

**Вячаслаў ДАНІЛОВІЧ:** Гісторыя Беларусі вельмі багатая і унікальная, і ў кожным яе перыядзе нам ёсць чым ганарыцца і за што быць удзячнымі сваім продкам. Тым больш нам няма чаго саромецца падзей верасня — лістапада 1939 года, калі адбыўся акт гістарычнай справядлівасці — уз'яднанне беларускага народа ў адзінай беларускай дзяржаве. Гэта вельмі істотны момант, і якім шляхам ён адбыўся — тут няма нічога экстраардынарнага, ніякія нормы тагачаснага міжнароднага права не былі парушаныя, савецкае кіраўніцтва дзейнічала ў рэчышчы падзей, якія тады развіваліся. І гэта прынесла важны вынік для нас і нашай дзяржаўнасці.

Згодны, што адпаведнае свята павінна быць аднесена да дзяржаўных, яго трэба належным чынам адзначаць. Лічу, што найбольш аптымальная дата — 14 лістапада, яе можна назваць «Днём нацыянальнага адзінства». Дата мела лёсавызначальнае значэнне для далейшага паспяховага развіцця беларускага народа і беларускай дзяржавы.

Патрэбны і адпаведны помнік у нашай сталіцы, ён замацуе падзею ў гістарычнай памяці народа і маладога пакалення. Мы павінны ганарыцца сваёй гісторыяй, на якую глядзім аб'ектыўна і вачыма свайго народа.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**Марыя ДАДАЛКА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## о проведении 16 октября 2020 года торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»

| Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе) | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| № предмета торгов | Наименование имущества | Год выпуска | Инвентарный номер | Номер шасси | Начальная цена, бел. руб, без учёта НДС | Размер задатка, бел. руб. |
| 1 | Прицеп МАЗ-870100-3010 | 2008 | 5003822 | Y3M87010080000014 | 6 728,62 | 600,00 |
| 2 | Прицеп МАЗ-870100-3010 | 2008 | 5003823 | Y3M87010080000015 | 6 727,92 | 600,00 |
| 3 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2008 | 5003744 | Y3M54400880006124 | 10 615,48 | 1 000,00 |
| 4 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2008 | 5003746 | Y3M54400880006122 | 11 085,84 | 1 100,00 |
| 5 | Седельный тягач МАЗ-544019-421-031 | 2008 | 5003761 | Y3M54401980000026 | 15 023,36 | 1 500,00 |
| 6 | Седельный тягач МАЗ-544019-420-031 | 2008 | 5003759 | Y3M54401980000023 | 16 108,07 | 1 600,00 |
| 7 | Полуприцеп МАЗ-975830-3016 | 2008 | 5003731 | Y3M97583080003298 | 7 663,42 | 700,00 |
| 8 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2008 | 5003745 | Y3M54400680006125 | 13 010,90 | 1 300,00 |
| 9 | Автобус МАЗ-152021 | 2002 | 5003398 | Y3M15202120000097 | 9 129,33 | 900,00 |
| 10 | Специальная МАЗ-490143 | 2013 | 4520281 | Y3M490143D0000019 | 22 303,59 | 2 200,00 |
| 11 | Самосвал МАЗ 55513 2-325 | 2003 | 5003866 | Y3M55513230000021 | 7 032,27 | 700,00 |
| 12 | Седельный тягач МАЗ-544019 | 2008 | 5003797 | Y3M54401980000030 | 16 988,80 | 1 600,00 |
| 13 | Седельный тягач МАЗ-544019 | 2008 | 5003764 | Y3M54401980000028 | 15 085,60 | 1 500,00 |
| 14 | Седельный тягач МАЗ-544019 | 2008 | 5003762 | Y3M54401980000031 | 16 254,81 | 1 600,00 |
| 15 | Седельный тягач МАЗ-5440А8 | 2008 | 5003912 | Y3M5440A880001134 | 17 495,05 | 1 700,00 |
| 16 | Седельный тягач МАЗ-544008 | 2007 | 5003710 | Y3M54400870005867 | 8 157,68 | 800,00 |
| 17 | Седельный тягач МАЗ-5440А3 | 2010 | 5004191 | Y3M5440A3A0000047 | 12 162,21 | 1 200,00 |
| 18 | МАЗ-6303А3 (кс-55727-1) | 2008 | 4253640 | Y3M6303A370000002 | 60 577,17 | 6 000,00 |
| 19 | Самосвал МАЗ-651608 | 2007 | 5003915 | Y3M65160870000001 | 29 094,05 | 2 900,00 |
| 20 | Бортовой МАЗ-6312V5 | 2010 | 5003992 | Y3M6312V5A0000021 | 23 965,76 | 2 300,00 |
| 21 | Бортовая МАЗ-631236 | 2012 | 5004337 | Y3M631236C0000038 | 30 002,97 | 3 000,00 |
| 22 | Бортовая МАЗ-631236 | 2012 | 5004319 | Y3M631236C0000039 | 29 209,98 | 2 900,00 |
| 23 | Бортовая МАЗ-631236 | 2012 | 5004320 | Y3M631236C0000020 | 29 209,98 | 2 900,00 |
| 24 | Бортовая МАЗ-6312В3 | 2008 | 5004025 | Y3M6312B380000001 | 12 439,34 | 1 200,00 |
| 25 | Бортовая МАЗ-6312А8 | 2008 | 5003828 | Y3M6312A880000130 | 15 604,52 | 1 500,00 |
| 26 | Полуприцеп МАЗ-975830-3012 | 2005 | 5003522 | Y3M97583050000953 | 2 657,14 | 200,00 |
| 27 | Полуприцеп МАЗ-9758 | 2005 | 5003430 | Y3M97580050007478 | 2 557,83 | 200,00 |
| 28 | Полуприцеп МАЗ-975830-3012 | 2005 | 5003454 | Y3M97583050000557 | 2 992,56 | 200,00 |
| 29 | Полуприцеп МАЗ-975830-3012 | 2005 | 5003453 | Y3M97583050000558 | 3 017,84 | 300,00 |
| 30 | Полуприцеп МАЗ-975830-3032 | 2006 | 5003902 | Y3M97583060001454 | 4 691,04 | 400,00 |
| 31 | Полуприцеп МАЗ-975830-3012 | 2006 | 5003569 | Y3M97583060001219 | 3 113,88 | 300,00 |
| 32 | Полуприцеп МАЗ-975830-3012 | 2004 | 5003405 | Y3M97583040000363 | 3 688,13 | 300,00 |
| 33 | Полуприцеп МАЗ-9758 | 1998 | 5001612 | Y3M975800W0001001 | 2 396,88 | 200,00 |
| 34 | Полуприцеп МАЗ-975830 3016М | 2007 | 5003698 | Y3M97583070002568 | 8 720,06 | 800,00 |
| 35 | Автомобиль МАЗ-5337 | 2001 | 4508652 | Y3M53370010039500 | 2 461,79 | 200,00 |
| 36 | Седельный тягач МАЗ-643018 | 2007 | 5003969 | Y3M64301870000001 | 26 488,96 | 2 600,00 |
| 37 | Бортовой МАЗ-4371Р2-432-000 | 2013 | 5004409 | Y3M4371P2D0000497 | 14 914,78 | 1 400,00 |

**Местонахождение имущества:** г. Минск, ул. Промышленная, 2 и г. Минск, пер. Промышленный, 7.

**Продавец имущества:** ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», ул. Социалистическая, 2, 220021, г. Минск.

**Организатор торгов:** государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

**Условие торгов:** победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

*Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционных торгах от 16.10.2020 по предмету торгов №__.*

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 15 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Торги проводятся **16 октября 2020 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 17.09.2020 по 13.10.2020 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**

**(017) 360-42-22, (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);**

**(017) 395-62-96 (ОАО «МАЗ» – управляющая компания холдинга «БЕЛАВТОМАЗ»).**

# СЛОБОДСКОЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ УЗДЕНСКОГО РАЙОНА МИНСКОЙ ОБЛАСТИ
## 13 октября 2020 года по адресу: аг. Слобода, ул. Школьная, 5, зал заседаний (2-й этаж) в 11.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

| № лота | Продавец | Местонахождение участка | S (га) | Кадастровый номер | Начальная цена (бел. руб.) | Расходы по подготовке (кроме расходов на публикацию извещения) (бел. рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Лот № 1 | Слободской с/Совет | д. Верхнёман, ул. Центральная, уч. 14 | 0,2337 | 625681301601000001 | 2828 | - |
| Лот № 2 | Слободской с/Совет | д. Долгиново, ул. Центральная, уч. 4А | 0,1500 | 625683203501000098 | 2250 | 966,23 |
| Лот № 3 | Слободской с/Совет | д. Долгиново, ул. Центральная, уч. 63 | 0,1306 | 625681304101000092 | 1900 | 63,10 |
| Лот № 4 | Слободской с/Совет | д. Антоново, ул. Центральная, уч. 4а | 0,2387 | 625681300101000029 | 2993 | - |
| Лот № 5 | Слободской с/Совет | д. Жачково, ул. Центральная, уч. 19 | 0,1740 | 625680403601000019 | 1340 | 48,60 |
| Лот № 6 | Слободской с/Совет | д. Сеножатки, ул. Озёрная, уч. 32Б | 0,1737 | 625683207901000105 | 17000 | 1488,97 |
| Лот № 7 | Слободской с/Совет | д. Костюки, ул. Центральная, уч. 55 | 0,2500 | 625683205301000107 | 15000 | 1130,86 |
